Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ
25
1933 г.
№ 44 (4588)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ПРЫВІТАНЬНЕ тав. СТАЛІНА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ У СУВЯЗІ З ЯЕ 15-ГОДЗЬДЗЕМ

Рэвалюцыйнаму Ваеннаму Савету Саюзу ССР

Прывітаньне байцом, камандзірам і палітработнікам Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії!

Чырвоная армія, створаная пад кіраўніцтвам Леніна, пакрыла сябе неўвядаемай славай у вялікіх бойках грамадзянскай вайны, выгнаўшы з СССР інтэрвэнтаў і абараніўшы справу сацыялізму ў нашай краіне.

Чырвоная армія зьяўляецца цяпер аплотам міру і мірнай працы рабочых і сялян і няўсыпным вартавым межаў Савецкага саюзу.

Рабочыя нашай краіны, пераможна завяршыўшы пяцігодку за чатыры гады, узброіваюць Чырвоную армію новымі прыладамі абароны.

Ваша справа, таварышы,—навучыцца дасканала ўладаць гэтымі прыладамі і выканаць свой абавязак перад краінай, калі ворагі папрабуюць напасьці на яе.

Таварышы! Трымайце вышэй сьцяг Леніна, сьцяг барацьбы за камунізм!

Няхай жыве гераічная Чырвоная армія, яе кіраўнікі, яе Рэвваенсавет!

СТАЛІН.

Наша бліжэйшая задача—зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі

Так акрэсьліў сэнс і мэту барацьбы, якая дазгортваецца за ўмацаваньне калгасаў, тав. Сталін у сваёй прамове на першым Усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў. Гэта прамова тав. Сталіна ў спалучэньні з яго выступленьнямі на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК аб выніках першай пяцігодкі і аб працы ў вёсцы, дае ўсеахапляючую праграму работ партыі ў галіне сельскай гаспадаркі і адначасова зьяўляецца каштоўнейшым укладам у аграрную тэорыю ленінізму.

Нібы стараецца пытаньне аб шляхох разьвіцьця. Але чаму праваднір партыі зноў і зноў варочаецца да гэтага пытаньня, аб якім, сумленна кажучы, нашы «тэарэтыкі» лічаць нібы непатрэбным многа гаварыць? Тав. Сталін зноў узьнімае гэта пытаньне на новую прынцыповую вышыню, грунтуючыся ня толькі на тэарэтычных прадпасылках, але і на пасьпеўшым ужо праявіцца практычнай барацьбы і работы ў сьвядомасьці найпярэйшых пластоў калгаснага актыву, узьнімае тамму, што **ёсьць яшчэ частка працоўнага сялянства, і ня толькі аднаасобнага, але і калгаснага**, якая сумняваецца ў правільнасьці калгаснага шляху.

«Ці павінны мы расьсеяць гэтыя сумненьні?—пытаецца на зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў тав. Сталін. Ці павінны мы выставіць іх, гэтыя самыя сумненьні, на сьвет божы і паказаць—чаго яны варты? Ясна, што павінны».

Калі ты камуніст, партыец—ты не ганарыся тым, што для цябе ўжо ўсё ясна, што ў цябе ніякіх сумненьняў адносна правільнасьці калгаснага шляху няма. Ты ўлічы, што вакол цябе нямала людзей, якім можа быць яшчэ няясна тое, што ясна табе, і не ганарыся, не праходзь міма іх сумненьняў, ня лай іх за тое, што яны такія незразумелыя. **Церпяліва, па-ленінску, па-бальшавіцку растлумачвай і даказвай, расьсейвай гэтыя сумненьні.**

Гэта і ёсьць ленінскае кіраўніцтва. Гэта і ёсьць ленінскі мэтад у рабоце.

Толькі адыдзіўшыся ад старога, аднаасобнага ладу жыцьця на рад год, толькі прабіўшыся да новага ў жорсткіх бабёх з векавечным, самым цэпкім і шматлікім ворагам сваім—кулацтвам, толькі агледзеўшы лад калгаснага жыцьця, усё мінулае, радавы працоўны селянін пачынае разумець, што ён выбраўся з такога балота, якое ў выпадку, калі-б ён чапляўся за яго і далей **засасала-б яго канчаткова, вярнула-б яго назад, пад уладу памешчыка, фабрыканта, кулака, пад уладу буржуазнага ўраду.**

Вось чаму з новай сілай, з новай перакананасьцю гучаць сёньня для шырокіх мас сялянства словы тав. Сталіна: «Ёсьць толькі два шляхі: **або наперад, на гару—да новага калгаснага ладу, або назад, з гары—да старога, кулацка-капіталістычнага ладу.** Трэцяга шляху няма».

За першыя два-тры гады калгаснага будаўніцтва мы дабіліся таго, што «ня менш 20 млн. сялянскага насельніцтва, ня менш 20 млн. беднякоў—вызвалілі ад галечы і разбурэньня, выратавалі ад кулацкай кабалы і ператварылі, дзякуючы калгасам у забясьпечаных людзей. Мільённыя масы беднякоў, якія раней жылі ў прогаладзь, сталі цяпер у калгасах сераднякам, людзьмі забясьпечанымі. Гэта такое дасягненьне, якога ня ведаў яшчэ сьвет і якога яшчэ не дасягала ні адна капіталістычная дзяржава ў сьвеце» (Сталін).

Вось чаму так адчувальнай стала цяпер для кожнага селяніна сувязь калгаснага шляху з лёсам савецкай ўлады, з лёсам кастрычніцкіх завяваньняў.

Але гэтага мала. На гэтым **першым** дасягненьні партыя не затрымліваецца. Яна ставіць новую задачу, яна робіць другі крок. «У чым заключаецца гэты другі крок? Ён заключаецца ў тым, каб узьняць калгасьнікаў—былых беднякоў і былых сераднякоў — яшчэ вышэй. Ён заключаецца ў тым, каб **зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі**».

Ці пад сілу гэта задача? Так, пад сілу і зусім магчымая да ажыцьцяўленьня, бо ў нас ужо ёсьць тысячы калгасаў, якія могуць паказаць практычныя вынікі ў гэтым кірунку. Пад сілу таму, што **галоўныя труднасьці на шляху калгаснага будаўніцтва ўжо пройдзены**, і ў распараджэньні калгасаў і калгасьнікаў ёсьць усё неабходнае для дасягненьня гэтай мэты.

«Сіла ў вашых руках»,—сказаў калгасьнікам-ударнікам тав. Сталін, у самым пачатку сваёй прамовы й заля ёдказала на гэтыя словы бурай апладысмэнтаў. Гэта ня быў, як некаторыя могуць падумаць, звычайны аратарскі прыём. Не, гэтай думкай, гэтым словам прасякнута ўся прамова тав. Сталіна ад пачатку да канца. І патрэбаваньне да камуністаў ня толькі вучыць, але і вучыцца ў беспартыйных, і пастраўка да ліста бязпачуцкіх калгасьнікаў, і акрэсьленьне, што сацыялізм ў праца неадлучны адзін ад другога, усё гэта і іншыя месцы прамовы зьяўляюцца выразам тэй самай думкі.

Ці можна дабіцца гэтай мэты, г. зн. зрабіць заможнымі ўсіх беднякоў і сераднякоў без калгасаў, намімо калгаснага шляху? Усім яшчэ памятны дэмагагічныя па форме і авантурна-рэакцыйныя па зьместу патрабаваньні зінопоўеўскай апазыцыі даць кожнаму па каню. Усё яшчэ памятна праваапартуністычная тэорыя ўрастаньня кулака ў сацыялізм, якая суправаджалася лёзунгамі: «узбагачайцеся», «накапляйце ў добры час».

Да чаго-бы гэта прывяло партыю, савецкую ўладу, рабочых і працоўнае сялянства, калі-б апазыцыянэры і правыя апартуністы не атрымалі зьнішчальнага адпору, калі-б яны ня былі разгромлены?

Да ўзбагачэньня і ўлады кулака, да поўнай рэстаўрацыі капіталізму. Бо «для таго, каб стаць заможным (пры аднаасобным ладзе вёскі. Рэдакцыя), трэба было крыўдзіць сваіх суседзяў, трэба было паэксплёатаваць іх, прадаўшы ім даражэй і купіўшы у іх таней, нажыць сяго-таго з батракоў, паэксплёатаваць іх як належыць, накапіць капітал і, умацаваўшыся, пралезьці потым у кулакі» (Сталін).

Гэтай азбукі марксызму-ленінізму так і не маглі зразумець прыхільнікі «трэцяга шляху»!

Ці шмат трэба для таго, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі?

Не, ня многа. **«Варта толькі палепшыць скарыстаньне машын і трактараў, варта толькі палепшыць апрацоўку зямлі,—і мы даб'емся таго, што павялічым колькасьць нашых прадуктаў удвая-ўтрая. А гэтага зусім даволі для таго, каб зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі працаўнікамі калгасных палёў». (Сталін).**

«Сіла ў нашых руках», у руках пе радавой часткі калгасьнікаў, якімі кіруе партыя. Ад гэтай сілы залежыць зараз пасьпяховае выраўнаньне новай задачы сусьветна-гістарычнага значэньня. Гэта зразумеў і ацаніў **сёньня** зьезд прадстаўнікоў перадавых калгасаў, які паклаў гэту думку тав. Сталіна ў аснову сваёй адозвы.

«Ад вас—гаварыў тав. Сталін калгасьнікам,—патрабуецца толькі адно—працаваць чэсна, дзяліць калгасныя даходы паводле працы, берагчы калгаснае дабро, берагчы трактар і машыны, устанавіць добры дагляд каня, выконваць заданьні вапшага рабоча-сялянскага ўраду, умацоўваць калгасы і выпыбаць вон з калгасаў пралезьных туды кулакоў і падкулачнікаў».

І сапраўды, хіба-ж труднасьці, якія стаяць на шляху ажыцьцяўленьня гэтай праграмы ў якой небудзь меры можуць параўнацца з тымі сапраўднымі труднасьцямі, калі трэба было павярнуць на калгасны шлях, які ня досыць быў вядомы мільёнам, аспоўную масу сялянства, калі гэтую масу сялянства трэба было падняць супроць кулацтва, калі трэба было разграміць і ліквідаваць гэтага сур'ёзнага і небясьпечнага ворага?

Тысячы раз мае рацыю тав. Сталін, калі ён гаворыць, што ў параўнаньні з тымі галоўнымі труднасьцямі, цяперашнія не заслугоўваюць нават таго, каб аб іх сур'ёзна гаварыць.

Сіла ў нашых руках. Гэта павінны даказаць цяпер-жа ўсе партыйныя арганізацыі, усе камсамольцы, усе перадавыя чэсныя калгасьнікі, рыхтуючыся да вясны, рыхтуючыся да весняй сяўбы. Прамова тав. Сталіна выдатна іменна тым, што яна мабілізуе партыю і масы на вырашэньне новай гістарычнай задачы, робіць удзік усіх рухавых сіл сацыялізму і вызначае асноўныя задачы для кожнага баявога атраду. Яна разам з тым у вялізарнай меры аслабляе рэшткі сіл клясавага ворага, рэшткі яго ўплыву, выпыбае ў яго з пад ног апошнюю глебу.

Партыйныя арганізацыі і беспартыйныя калгасны актыў атрымліваюць такім чынам у барацьбе за ўмацаваньне калгасаў, за заваяваньне большасьці ў калгасах, за ўзорнае правядзеньне весьнавой сяўбы новую зброю выключнай сілы. Гэту зброю трэба пабальшавіцку выкарыстаць.

Першы ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў бясспрэчна зьяўляецца адзэй з найбольш яркіх старонак у гісторыі барацьбы за сацыялізм. І як усякі выдатны акт гэтай барацьбы, ён далёка выходзіць за межы нашай краіны, набываючы вялізарнае міжнароднае значэньне. З няўмольнай ясьнасьцю акрэсьлівецца нямінучы вынік спаборніцтва двух сыстэм—капіталістычнай і сацыялістычнай. У той час, як спарахнелы капіталізм усё больш і больш выяўляе сваё бясьсільле выбрацца з пятлі крызісу, які моцна захліснуў яго, у той час, як у сударажных спробах вызваліцца з гэтай пятлі ён кідае новыя і новыя мільёны працоўных у пучыну галечы і зруйнаваньня,—сацыялізм пераможна высоўвае новы лёзунг—заклік, лёзунг сёньняшняга дня, новыя і новыя мільёны працоўных пад ніц «да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і відуць зусім культурнае жыцьцё» (Сталін).

«Гэтага мы можам дабіцца і гэтага мы павінны дабіцца ва што-б там ні стала!» (Скарочаная перадавая «Праўды», перададзеная па радыё).

Новыя дакументы Ул. І. Леніна

Ніжэй друкуюцца чатыры тэлеграмы Ул. Ільліча з яго вялікай ваеннай пераапіскі ў якасьці ўзораў, якія характарызуюць кіруючую ролю Леніна ў справе арганізацыі абароны Савецкай Рэспублікі ў эпоху грамадзянскай вайны.

Інстытут Маркса-Энгельса-Леніна пры ЦК УсеКП(б).

Тэлеграма Рэввaенсавету Ўсходняга фронту

6 чэрвеня 1919 г. Сімбірск.

Рэввaенсавет Усходняга фронту: Гусеву, Лашэвічу.

Становішча на поўдні такое цяжкае, што наўрад ці зможам даць вам папаўненьні. 1) Прыдзецца вам налегчы з усіх сіл на мабілізацыю, часамі пагалоўную, прыфрантовай паласы, на мясцовыя ваенізагі і на збор вінтовак з насельніцтва. Расстрэльвайце за ўтойваньне вінтовак. (Ваша маўчаньне на запытаньне аб Глазове дзіўна і недапушчальна). 2) Лічу найвялікшай небясьпекай магчымы рух Калчака на Вятку для прарыву да Ніцера. Зьвярнеце сур'ёзнейшую увагу, паведамляйце часьцей аб фронце пад Глазовым. 3) Мы са Склянскім адпраўляем туды папаўненьне, хоць Муралаў дзіўным спосабам маўчыць і сам папаўненьняў ня просіць.

Ленін.

1) У канцы мая 1919 г. фронт 9 Чырвонай армії быў прарваны Дзянікіным ля Мілерова, што выклікала апушчы адыход войск паўднёвага фронту і часовую ўтрату Далбасу.

2) Словы, узятыя ў дужкі, закрэсьлены Леніным.

3) Глазоў знаходзіцца на дарозе з Пермі ў Вятку. Рух армії генэрала Гайды на Глазоў аказаўся беспасьпяховым для белых і Гайда, таксама як і іншыя армії Калчака, вымушан быў пракідаваць адступленьне пад націскам чырвоных войск усходняга фронту. 9 чэрвеня нашы войскі пад кіраўніцтвам тав. Фрунзэ ўзялі Уфу. 30 чэрвеня была ўзята Пермь.

Тэлеграма тульскаму зьезду мэталістаў*)

(11 ліпеня 1919 г.)

(Копію пасланць Мельнічанскаму)

ТУЛА. Прэзыдыум зьезду мэталістаў.

Вітаю (ад) усёй душы рашэньне тульскага зьезду мэталістаў падзесяцярыць выраб зброі і інш. Прашу паведамляць мне штомесячна поштай або з аказіяй, якія іменна фактычныя посьпехі па ўсіх вашых рашэньнях дасягаюцца.

*) Пасланна ў адказ на наступную тэлеграму тульскіх мэталістаў: «Тульскі губэрскі зьезд рабочых мэталістаў просіць Вас, таварыш Ленін, перадаць Савету Народных Камісараў сацыялістычную клятву мэталістаў памерці або перамагчы айчынных і замежных імпэрыялістаў. Зьезд пастанавіў падзесяцярыць выраб зброі неадкладна, правесьці сярод рабочых усеагульнае вайсковае навучаньне, сфармаваць жалезныя рабочыя дывізіі шаткі, гатовыя ў патрэбную мінуту проста з заводаў кінуцца ў бой з белагвардзейцамі. Няхай жыве Рабоча-Сялянскі Расійскі Ўрад. Прэзыдыум зьезду».

Запіска Э. Склянскаму*)

15 кастрычніка 1919 г.

тав. Склянскі!

Абсалютна неабходны для паўднёвага фронту кавалерыйскія радыёстанцыі, а таксама пальвыя перасоўныя лёгкага тыпу, якія ёсьць у вялікай колькасьці на складах галоўнага ваеннага інжынернага кіраўніцтва. Зрабеце неадкладна распараджэньне аб тэрміновай перадачы паўднёваму фронту па 50 штук таго і іншага тыпу. Гэта патрабуе Сталін, які вельмі скардзіцца на недахват сувязі.

Пашпэцэ мне, што іменна Вы зрабілі, а; да рэчы, закажэце для мяне ў Гыў кароткую зводку агульнага ліку радыёстанцый у іх і размеркаваньне па войсках.

Ст. С. Аб. У. Ульянаў (Ленін).

*) На працяту вераснія і пачатку кастрычніка 1919 г. Дзянікін дасягнуў значных посьпехаў на паўднёвым фронце. 13 кастрычніка яму ўдалося аўладаць Арлом. Для зьнічэньня вельмі цяжкага і небясьпечнага для рэспублікі становішча, якое стварылася ў результаце доўгіх няўдач на паўднёвым фронце, ЦК партыі накіраваў у Рэввaенсавет фронту тав. Сталіна. Тав. Сталін выпрацаваў новы стратэгічны плян барацьбы з Дзянікіным, які быў зацьверджаны Леніным і Цэнтральным Камітэтам партыі. Ажыцьцяўленьне гэтага пляну прывяло да поўнага паражэньня і разгрому Дзянікіна.

Тэлеграма Рэввaенсавету і коннай арміі*)

4 кастрычніка (1920 г.)

Па простаму проваду

РВС І коннай

Вельмі важна з усіх сіл паскорыць перасоўваньне вашай арміі на паўднёвы фронт. Прашу прыняць для гэтага ўсе меры, ня спыняючыся перад гераічнымі. Тэлеграфуйце, што іменна робіце.

Старшыня савабароны ЛЕНІН.

*) 1-я конная армія т. Будзённага знаходзілася ў гэты час на польскім фронце. Перакідка яе на паўднёвы фронт выклікалася неабходнасьцю ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць Урангеля.

Вышэйшая рэвалюцыйная ўзнагарода

Пастановай прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік ад 21 лютага 1933 г., абвешчанай загадам РВС СССР, узнагароджан цэлы рад таварышоў. Сярод іх ОРДЭНАМ ЛЕНІНА ўзнагароджаны наступныя таварышы:

Тав. ГАМАРНІК ЯН БАРЫСАВІЧ — намесьнік народнага камісара па ваенных і морскіх справах і старшыні РВС СССР — за выдатную работу па ўмацаваньні абароназдольнасьці СССР;

ТАВ. ТУХАЧЭЎСКІ МІХАІЛ МІКАЛАЕВІЧ — намесьнік народнага камісара па ваенных і морскіх справах і старшыні РВС СССР — за выключныя асабістыя заслугі перад рэвалюцыяй у справе арганізацыі абароны Саюзу ССР на зьнешніх і ўнутраных франтох у пэрыяд грамадзянскай вайны і за далейшыя арганізацыйныя мерапрыемствы па ўмацаваньні магутнасьці РСЧА;

ТАВ. ХАЛЕПСКІ ІНАКЕНЦІ АНДРЭЕВІЧ — начальнік УММ РСЧА — за асабліва выдатныя заслугі ў справе ўмацаваньня тэхнічнай магутнасьці РСЧА.

Ордэнам «ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ» узнагароджан тав. КРЫЛЕНКА МІКАЛАЙ ВАСІЛЬЛЕВІЧ — першы вярхоўны галоўнакамандуючы пралетарскай арміяй — за выключныя заслугі перад рабочай класай СССР у справе барацьбы з ворагамі савецкай сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Першым ордэнам «Чырвонага Сьцягу» сярод раду таварышоў узнагароджан тав. ЗІНОЎЕЎ ГРЫГОРЫ АЛЯКСЕЕВІЧ — намесьнік начальніка палітвіраўніцтва БВА.

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА таксама ўзнагароджаны за каштоўныя вынаходзтвы і канструкцыі ў тэхніцы РСЧА, спрыяўшыя ўмацаваньню абароназдольнасьці Саюзу ССР: тав. ДЗЕХЦЯРОЎ ВАСІЛЬ АЛЯКСЕЕВІЧ — канструктар; т. ТУПОЛЕЎ АНДРЭЙ МІКАЛАЕВІЧ — начальнік канструктарскага бюро; тав. ШОРЫН АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ — інжынэр.

Тав. ТОКАРАЎ ФЁДАР ВАСІЛЬЛЕВІЧ — канструктар — узнагароджан ордэнам «Чырвонай Зьвязды».

Многія таварышы ўзнагароджаны так сама за выключную адвагу, мужнасьць і ўмепае кіраўніцтва баявымі дзеяньнямі, за выдатную работу, спрыяўшую тэхнічнаму аснашчэньню РСЧА, а таксама за выдатную работу па ўмацаваньні баявой гатоўнасьці войск.

Аб ходзе загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў па БССР

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне аб ходзе загатовак сельска - гаспадарчых прадуктаў у БССР, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што ход загатовак па БССР з усёй нагляднасьцю пацьвярджае абсалютную правільнасьць пастановы ЦК УсеКП(б) аб неадкладнай рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР у справе кіраўніцтва загатоўкамі сельска - гаспадарчых прадуктаў.

Той факт, што ў другой палове сьнежня месяца, пасьля пастановы ЦК УсеКП(б), партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі здолелі сапраўды па-баявому выканаць у кароткі тэрмін (каля 50 проц. гадавога пляну, які застаўся) і поўнасьцю загатоўкі збожжа, мяса і ў студзені месяцы — бульбы, і тая акалічнасьць, што па загатоўках ільна-валакна, малочных прадуктаў, гарнцаваму збору і закупцы збожжа — БССР плянецца ў хвасьце раду абласьцей Саюзу — сьведчыць, што партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі да гэтага часу не зрабілі неабходных вывадаў у сваёй рабоце з пастановы ЦК УсеКП(б) і ня ўлічылі ўсяго вопыту сьнежня месяца па барацьбе за загатоўкі.

Многімі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі (ня толькі раённымі, але і цэнтральнымі) не вядзецца, як належыць узмоцненая барацьба з славесна-дэкларацыйнымі адносінамі камуністаў да правядзеньня генэральнай лініі партыі і ўзмоцненая барацьба з гніла-перараджэнскімі элементамі ў партыі, якія вельмі часта прыкрываюць сваю антысавецкую работу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што пасьпяховае правядзеньне дзяржаўных загатовак магчыма толькі на аснове разгорнутай барацьбы за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК УсеКП(б): «што толькі ачысьціўшы рады партыі ад гэтых буржуазных перараджэнскіх элементаў і на справе даўшы іх уплыву бальшэвіцкі адпор, камуністычная партыя Беларусі здолее зламаць супраціўленьне, якое арганізуецца кулацкімі і іншымі антысавецкімі элементамі справе загатовак сярод аднаасобнікаў і калгасьнікаў, і ўмацаваць калгасы шляхам згуртаваньня калгасных масы вакол сапраўды перадавых калгасьнікаў у актыўнай барацьбе з разлагаючым уплывам пралезьных у іх чужых, спэкулянцкіх і наогул антысавецкіх элементаў, якія сабатуюць дзяржаўныя загатоўкі».

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае дрэнны ход выкананьня пляну ільназагатовак па БССР (на 15 лютага г. г. — 86,5 проц. выкананьня гадавога пляну), які сьведчыць аб зрыве выкананьня пляну ва ўстаноўлены ЦК КП(б)Б тэрмін як па рэспубліцы ў цэлым, так і па большасьці раёнаў, што зьяўляецца вялікай ганьбой для ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР.

Асабліва ганебным, проста злачынным зьяўляецца становішча загатовак ільнавалакна па наступных раёнах: Сіроцінскім, Мсьціслаўскім, Сененскім, Горацкім, Полацкім, Веткаўскім, Расонскім, Асьвейскім, Вушацкім, Бягомльскім, Чэрвеньскім, Камарынскім, Клічаўскім, Рэчыцкім, Заслаўскім і Віцебскім.

Улічваючы, што важнейшай вядучай тэхнічнай сельска - гаспадарчай культурай ў БССР зьяўляецца лён і ў гэтай галіне БССР займае адзін з важнейшых вучасткаў у СССР, пленум ЦК і ЦКК лічыць, што гэта накладае вялізарныя абавязкі і адказнасьць на ЦК, ЦКК, СНК і ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі ў БССР за бязумоўнае і поўнае выкананьне дзяржаўнага пляну ільназагатовак, маючы на моце, што ўжо на сёньняшні дзень ёсьць 25 раёнаў, выканаўшых свае заданьні па ільну на 100 проц.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б патрабуе ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР, на аснове мабілізацыі калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас, рашучай барацьбы з кулацтвам і яго агентамі ў партыі і савецкім апараце — скончыць поўнае выкананьне пляну ільназагатовак да 27 лютага 1933 г. з тым, каб да 1-га сакавіка былі падведзены вынікі аб поўным выкананьні пляну.

Пленум ЦК і ЦКК папярэджвае РК і РВК, што гэты тэрмін зьяўляецца канчатковым. Пленум ЦК і ЦКК ухваляе меры, прынятыя бюро ЦК адносна раду ільнаводных раёнаў і даручае бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК у далейшым прыняць строгія меры спагнаньня да партыйнага і савецкага кіраўніцтва раёнаў, поўнасьцю невыканаўшых пляны ільназагатовак да паказанага тэрміну.

Прыняць ход і арганізацыю загатовак малочных прадуктаў за першы квартал і работу Наркамснабу, Белкаапсаюзу і Белмасларраму ў гэтай галіне яўна незадавальняючым.

Пленум ЦК і ЦКК прапануе Наркамснабу, Белкаапсаюзу, Белмасларраму і ўсім раённым партыйным і савецкім арганізацыям прыняць рад мерапрыемстваў (масавай праверкі дазвяньня абавязацельстваў да кожнага калгасу, калгасьніка, аднаасобніка і выкананьня імі здачы прадукцыі, прыняцьця рашучых мер узьдзеяньня ў адносінах тых, што ўхіляюцца, падбор кадраў, забесьпячэньне тарай, інвэнтаром і інш.), якія забясьпечваюць поўнае і своечасовае выкананьне дзяржаўных пляноў загатовак малочных прадуктаў. Адначасова павесьці рашучую барацьбу з усякімі фактамі разбазарваньня малочных прадуктаў, разглядаючы гэтыя справы, як раскрадваньне дзяржаўнай маемасьці і супраціўленьне выкананьню дзяржаўных заданьняў.

Пленум ЦК і ЦКК абавязвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі дасягнуць поўнага выкананьня дзяржаўных пляноў загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў кожным калгасам, гаспадаркай калгасьніка і аднаасобніка, памятаючы, што невыкананьне пляну ўсімі гаспадаркамі стварае пагрозу зрыву выкананьню пляноў загатовак у наступных кварталах у цэлым.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК канстатуе ганебнае становішча выкананьня пляну намольнага збору па рэспубліцы і прапануе ўсім партыйным і савецкім арганізацыям прыняць, на аснове прынятых бюро ЦК пастаноў, меры, якія сапраўды забясьпечваюць поўнае выкананьне пляну намольнага збору, памятаючы, што апошні (намольны збор) зьяўляецца неадлучнай часткай пляну дзяржаўных загатовак.

Ухваліць пастанову бюро ЦК, якая ўстанаўляе парадак водпуску збожжа гарадом і раёнам у поўнай залежнасьці ад выкананьня пляну намольнага збору.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначае, што ня гледзячы на дырэктывы ЦК і СНК аб разгортваньні работы па закупцы збожжа, апошняя праводзіцца падзвычай кепска. Гэта зьяўляецца рэзультатам ня толькі невыстарчальнай увагі з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый да гэтай справы, але і ўпушчэньнем загатоўчых, закупачных і каапэрацыйных арганізацый перабудове ўсёй работы па закупцы збожжа з тым, каб забясьпечыць на справе канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай работай з іх боку (абсутнасьць увагі да пытаньняў асартымэнту тавараў, да штодзённага кантролю за гэтай справай, нежаданьне зьмяніць практыку загатоўчай сыстэмы на практыку закупкі збожжа з індывідуальным падыходам да калгасу, калгасьніка і аднаасобніка — бедняка і серадняка).

Пленум ЦК і ЦКК прапануе Упаўкамзагпа, Упаўнаважанаму Закупзбожжа, Белкаапсаюзу і ўсім раённым партыйным і савецкім арганізацыям прыняць неадкладна рад арганізацыйных і гаспадарчых мер, якія забясьпечваюць поўнае і своечасовае выкананьне пляну закупкі збожжа.

У мэтах пасьпяховага правядзеньня дзяржаўных загатовак ураджаю 1933 г. і ўлічваючы, што апошнія будуць працякаць ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы, пленум ЦК і ЦКК папярэджвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі аб недапушчальнасьці недацэнкі труднасьцей будучых загатовак і прапануе зьвярнуць выключную увагу на прапрацоўку пляну загатовак усіх сельска-гаспадарчых прадуктаў, своечасовае давядзеньне іх да калгасу, калгасьніка і двара аднаасобніка. РК, РВК, загатоўчыя і гаспадарчыя арганізацыі ў сваёй рэбоце павінны максімальна выкарыстаць вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне закону аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, разгарнуўшы вакол гэтага закону і кожнага пункту яго ў паасобку бальшавіцкую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Пленум ЦК і ЦКК асабліва патрабуе ад партыйных арганізацый увагі да праверкі стану работы і складу работнікаў загатоўчага апарату і падбору для яго лепшых праверэных работнікаў, прайшоўшых вопыт загатоўчай работы.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прымае да ніўхільнага кіраўніцтва крытыку і ўказаньні тав. Сталіна, зробленыя ім на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) і пастанову ЦК УсеКП(б) аб загатоўках у БССР.

Партарганізацыя БССР і ў першую чаргу яе кіруючыя кадры зробяць усе неабходныя вывады з пастановы ЦК УсеКП(б) і прамовы тав. Сталіна, сканцэнтруюць усе свае сілы на найхутчэйшай перабудове работы партыйных і савецкіх арганізацый, зьмене мэтадаў кіраўніцтва калгасамі, і не на словах, а на справе ўзьнімуць усю КП(б)Б на барацьбу за поўнае выкананьне пляну загатовак ільну і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў і на барацьбу за поўнае выкананьне пляну збожжазамупкі, ссыпкі пасевных фондаў, падрыхтоўку і пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі.

Рашаючая пяцідзённка ільназагатовак

Толькі пяць дзён засталіся да апошняга тэрміну сканчэньня ільназагатовак, вызначанага партыяй і ўрадам. Гэта пяцідзённка зьяўляецца рашаючай у адносінах выкананьня пляну. За час, які застаўся, трэба загатовіць каля 27.000 цэнтн., або 10,7 ПРОЦ. пляну.

Аднак, цяперашнія тэмпы работы ні ў якім разе не забясьпечваюць поўнага ажыцьцяўленьня гэтага баявога заданьня.

Штодзённы прырост мізэрны. У лютым ён ні разу не перавышаў 0,4 проц. пляну, а за апошнюю дэкаду зьнізіўся да 0,1—0,2 проц.

Зварачае на сябе ўвагу АДСТАВАНЬНЕ АСНОЎНЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ. Іх дрэнная работа зьніжае агульны процант выкананьня рэспубліканскага пляну; калі неільнаводныя раёны амаль завяршылі ільназагатоўкі, дык ільнаводчыя раёны выканалі толькі на 86,3 проц., У ЛІНІКУ АГУЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА БССР ВЫКАНАНА НА 89,3 проц.

Толькі адзін ЧАВУСКІ раён ідзе ў першай калёне барацьбітоў за лён, перавыканаўшы гадавое заданьне. Рашаючы ЛЁЗЬНЯНСКІ раён вось ужо месяц топчацца на месцы і толькі зараз, пасьля завяршэньня ўсіх тэрмінаў, канчае загатоўкі.

Самыя жорсткія меры павінны быць прыняты да арганізацый Сеньненскага, Асьвейскага, Мсьціслаўскага і Сіроцінскага раёнаў, якія цягнуцца ў хвасьце кампаніі. АПОШНІЯ ДВА РАЁНЫ НЯ ВЫКАНАЛІ НАВАТ І 70 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Ня гледзячы на неаднаразовыя папярэджаньні ЦК і СНК БССР, кіруючыя арганізацыі гэтых раёнаў не забясьпечылі пералому, не зламалі кулацкага сабатажу, не перамаглі дэмабілізацыйных настрояў. Сакратар Мсьціслаўскага РК тав. РАМАНЕНКА і ўпаўнаважаны тав. БЯЛУГА, сакратар Сіроцінскага РК тав. УСЕНКА і старшыня РВК тав. РАЖНОЎСКІ нясуць поўную адказнасьць за зрыў ільназагатовак.

ТАЛАЧЫНСКІ раён за апошнія дні паказаў баявыя тэмпы работы. Ён вышай у першыя рады і дабіўся зьняцьця з чорнай дошкі. РАЕН ДА 23 ЛЮТАГА ВЫКАНАЎ 97,9 ПРОЦ. пляну. Вопыт Талачыншчыны зьяўляецца лепшым адказам усім ніцікам, усім малаверам. Ён выразна сьведчыць аб рэальнасьці нашых пляноў, аб тым, што ЛЁН ЁСЬЦЬ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ І ГАСПАДАРЦЫ. Трэба ўмець яго сабраць.

У тым-жа Талачынскім раёне многія кіраўнікі і ўпаўнаважаныя паддаліся кулацкім настроям, хныкалі аб адсутнасьці ільну, шукалі розных прычын, каб апраўдаць прарыў. Калі-ж мацней ударылі па кулаку, прынялі рашучыя меры да перараджэнцаў, лён знайшоўся. Пры ўмове баявой работы і разгрому кулацкага сабатажу, адсталыя раёны таксама могуць з посьпехам завяршыць кампанію. Уся справа ў перамаганьні гнілых лібэральных адносін да манзўраў клясававорожых элемэнтаў.

Краіна патрабуе ад усіх раённых арганізацый—намагчы максімум сіл і энэргіі, каб да 1 сакавіка завяршыць загатоўкі ільнавалакна і забясьпечыць сырцом сацыялістычную прамысловасьць Саюзу.

Чорная дошка

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

СЕНЬНЕНСКІ (сакратар РК тав. **Дашукевіч,** старшыня РВК тав. **Себісевіч.***)

СІРОЦІНСКІ (сакратар РК тав. **Усенка,** старшыня РВК тав. **Ражноўскі.***)

За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы:

па **Бягомльскім раёне:** Дамбражыцкі сельсавет; па **Чашніцкім раёне:** Стражавіцкі; па **Клічаўскім:** Віркаўскі; па **Сураскім:** Камароўскі; па **Аршанскім:** Буеўскі; па **Пухавіцкім:** Гарэлецкі, Шацк

Узмацненьнем партыйнага кіраўніцтва камсамолам забясьпечым павышэньне яго ўдзелу ў выкананьні асноўных задач работы ў вёсцы

Бальшавіцкая сяўба—баявы экзамэн камсамолу

Камсамол Беларусі за апошнія гады вырас у шматмільённую арганізацыю. Гэты рост зьяўляецца адным з паказальнікаў вялізарнейшага ўздыму актыўнасьці і творчай ініцыятывы мас у нарыяд разгорнутага па ўсім фронце наступленьня сацыялізму.

Уступаючы ў рады ленінскага камсамолу, рабочая і калгасная моладзь, якая выхоўваецца там у духу марксыцка-ленінскага разуменьня сучасных задач партыі, атрымлівае магчымасьць больш арганізаванага ўдзелу ньня на ход сацыялістычнага будаўніцтва. Роля ленінскага камсамолу, як бліжэйшага памочніка ў выкананьні гэтых задач—вялікая.

Пераможны калгасны рух высунуў, як галоўную задачу ў калгасным будаўніцтве—**узмацніць калгасы арганізацыйна-гаспадарча і палітычна.** Зрабіць усе калгасы сапраўды **бальшавіцкімі,** забясьпечыць там правільную арганізацыю працы, рацыянальнае выкарыстаньне ўсіх сродкаў тэхнічнага пераўзбраеньня сельскай гаспадаркі, дабіцца ў найкарацейшы тэрмін максымальнага павышэньня ўраджайнасьці.

Да гэтых актуальнейшых пытаньняў дня прыкоўваецца ўвага ўсёй партыі, камсомолу і найшырэйшых мас калгаснага сялянства. Пасьпяховае вырашэньне гэтых пытаньняў бязумоўна залежыць ад перабудовы партыйнай і камсамольскай работы ў вёсцы ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай і задачамі, якія з выключнай глыбінёй і пераканальнасьцю ахарактарызаваў тав. **Сталін** у сваім дакладзе і прамове на стузеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Аднак, нельга сказаць, што камсамольская арганізацыя Беларусі поўнасьцю выкажала пастаўленыя перад ёй задачы. Камсамольцы ня ўсюды яшчэ заняли па-сапраўднаму сваё месца ў рабоце над арганізацыйным умацаваньнем калгасаў, разьвіцьцём сацыялістычных адносін да працы ў калгасах і ўмацаваньнем сьвядомай працоўнай дысцыпліны. Вызначаныя ЦК ЛКСМБ мерапрыемствы па правядзеньні агра-калгаснага паходу, якія ўключаюць у сябе ўсе асноўныя вагары арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў, аўлаўленьне тэхнікай калгаснай вытворчасьці, узьнятьцё ўраджайнасьці — ажыцьцяўляюцца на мясцох вельмі павольна.

Практычныя мерапрыемствы, якія забясьпечвалі-б выкананьне гэтых задач у радзе выпадкаў падмяняюцца дэкларацыйнасьцю, засядацельскай мітусьнёй і нізкамкай балбатнёй. Людзі засядаюць, пацеюць, спрачаюцца, сьпісваюць ворахі паперы па пастановы і на гэтым самазадаволена супакойваюцца, думаючы, што без канкрэтных мерапрыемстваў справа можа вырашыцца сама па сабе.

Узорамі такой «работы» адзначаецца кіраўніцтва **Чэрыкаўскай** раённай камсамольскай арганізацыі. На запытаньне аб тым, што канкрэтна ўжыта па правядзеньні агра-калгаснага паходу, РК ЛКСМБ пералічвае: задачы агра-паходу абмеркаваны на пасяджэньні бюро РК—раз; на нарадзе сакратароў ячэек—два; прынялі пастановы—тры і дагаварыліся з рэдакцыяй раённай газэты пакончыць асьвятленьня гэтага пытаньня—чатыры. І на гэтым крапка. А як камсамольцы прымаюць удзел у засыпцы насеньня, як яны садзейнічаюць рамонту с.-г. інвэнтару, складаньню пастаянных вытворчых брыгад, як расстаўлены камсамольскія сілы, аб гэтым ні слова.

Ці ўзяць хаця-б для прыкладу кіраўніцтва **Барысаўскай** арганізацыі ЛКСМБ. Там сакратар райкамолу тав. **Пагодзін** і інш. кіруючыя работнікі ў самы разгар разгортваньня падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы спакой на «адседжваліся» ў канцылярыі, старанна «рыпелі пер'імі» і ня мелі літа фальша ніякага ўяўленьня аб становішчы трактарнага парку і ходзе рамонту.

Паданыя факты не зьяўляюцца выключэньнем. **Агульнасьць у кіраўніцтве, дэкларацыйнасьць, дробна-буржуазная размагнізаванасьць у рабоце—найбольш характэрныя недахопы ў рабоце многіх вясковых камсамольскіх арганізацый.** Натуральна, што пакуль ня будуць зьлічаны гэтыя недахопы, камсамольскія арганізацыі будуць плесьціся ў хвасьце падзей, будуць адставаць ад тых задач, якія выражаюць сабой далейшыя посьпехі сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Пакончыць з дэкларацыйнасьцю ў кіраўніцтве, якая яшчэ дае сабе адчуваць ва многіх ячэйках і нават у райкоме, з бяспечнасьцю і расхлябанасьцю ў рабоце, па-бальшавіцку ўключыцца ў практычнае ажыцьцяўленьне стрыжнёвых задач работы ў вёсцы, узмацніць **вядучую** ролю гарадзкіх прамысловых арганізацый ЛКСМБ у адносінах да вясковых камсамольскіх арганізацый — над-такім пунктам гледжаньня і будзе праходзіць работа пленуму ЦК ЛКСМБ, які сёньня адкрываецца.

Задача партыйных арганізацый—узмацніць сваё кіраўніцтва камсамолам і гэтым самым забясьпечыць павышэньне яго ўдзелу ў практычным ажыцьцяўленьні задач, якія стаяць зараз у галіне сельскай гаспадаркі. Толькі пры гэтых умовах вясковыя камсамольскія арганізацыі павысяць сваю баяздольнасьць у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчаю ўмацаваньне калгасаў, ачышчаючы іх ад кулацкіх і інш. антысавецкіх элемэнтаў, у барацьбе за своячасовую падрыхтоўку да веснавой сяўбы, канцэнтруючы ўзгу на рашаючых зьвеньнях падрыхтоўкі: ссыпцы насеньня, рамонце трактараў і сельска-гаспадарчага інвэнтару і інш., якія вызначаюць пасьпяховае правядзеньне бальшавіцкай весны першага году другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Толькі пазбягаючы клясавую пільнасьць, толькі ў непрымірымай барацьбе з клясавым ворагам і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі ў барацьбе з вялікадзяржаўнымі і мясцовымі шавіністамі — камсамол выканае пастаўленыя перад ім задачы.

Узоры канкрэтнага ўдзелу

Бюро Менскага гарадзкога камітэту камсамолу падрыхтоўку да веснавой сяўбы распачало ў разгар загатовак. Своячасова распрацаваны і вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па ўдзелу камсамольскіх ячэек у гэтай важнейшай кампаніі.

Галоўная ўвага сканцэнтравана па ссыпцы насеньня і рамонце трактараў і ўсяго сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Завод **«Камунар»** па пляну павінен выпусьціць 5 тысяч поршневых калец. Камсамольская арганізацыя абавязалася паскорыць работу і выканаць яе не пазьней 11 сакавіка.

Калектыў ЛКСМБ заводу **«Ударнік»** узяў шэфства над Смалявіцкай МТС. Паслана спэцыяльная брыгада для паляпшэньня якасьці рамонту трактараў, якая прымае ўдзел у прыёме ня спраўных, здачы адрамонтаваных трактараў і г. д. У дапамогу послан камсамолец-спэцыяліст, які працуе на пармаваньні работы. Сіламі камсамольскіх моладзьных брыгад адліта 56 шасьцярэнак, патрэбных калгасам прыгарадных сельсаветаў.

Амаль усе ячэйкі і пінэрарганізацыі ўключыліся ў збор попелу. 30-га студзеня бюро гаркому арганізавала суботнік па збору попелу, у якім прымалі ўдзел 240 камсамольцаў і піонэраў. Гэты суботнік даў 9 тон попелу. 6 лютага таксама быў праведзен суботнік, на якім было сабрана 200 камсамольцамі з удзелам піонэраў 55 мазоў попелу. Трэці суботнік па збору попелу арганізавана 18 лютага.

Ня дрэнныя прыклады работы ёсьць і па ссыпцы насеньня. Напрыклад, камсамольская ячэйка калгасу **«Новы шлях»**, Асіпрашыцка-Гарадзецкага сельсавету, дапамагла ўзорна провесьці засыпку і ачыстку насеньня, і ўзяла шэфства па збору і захаваньні страхавых фондаў у адпаведным сэктары. Ячэйка калгасу **«Чырвоны Скарэніч»**, Падгойскага сельсавету, арганізаваўшы ссыпку насеньня ў сваім калгасе, сабрала 80 пудоў страхавых фондаў бульбы ў адпаведным сэктары.

Шырацца рады камсамольцаў ударнікаў падрыхтоўкі веснавой сяўбы. Лідэпічыкі заводу імя Варашылава т. т. **Багданоўскі, Лазоўскі** і іншыя на-ўдарнаму змагаюцца за выкананьне пляну вырабу трактарных частак. **Камсамолія гэтага заводу абавязалася сачыць за своячасовай адгрузкай дэталяй і адпраўкай па прызначэньні,** а для кіраўніцтва гэтай работы яна вылучыла члена бюро калектыву тав. **Амбразэвіча.**

Прыведзеныя прыклады, а іх можна значна пашырыць, сьведчаць аб тым, што Менская камсамольская арганізацыя актыўна рыхтуецца да веснавой сяўбы пад знакам барацьбы за ўздым ураджайнасьці. ГК ЛКСМБ кіруе гэтай работай апэрацыйна. Члены бюро ГК і сакратары калектываў прымацаваны да сельсавету і тры дні ў дэкаду працуюць у калгасах. Па пастанове бюро гаркому ўсе яго члены і сакратары вытворчых калектываў з пачатку сяўбы ўвесь час будуць працаваць у калгасах.

М. Сакалоўскі.

Партдзень без падрыхтоўкі

Сход Міхалеўскай парт'ячэйкі сакратар **Іванюў** абвясьціў адкрытым. Прэзыдыум выбрач. Парадак дня абвешчан: 1. Парткіраўніцтва камсамолам і падрыхтоўка камсамолу да веснавой сяўбы; 2. Вынікі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б); 3. Рознае.

Нішто сабе парадак! Ужо ён адзін паказвае, што арганізатары сходу кіраваліся прынцыпам: «Адбыць усё ад разу». Гэта першае. Па-другое, **ніякай падрыхтоўчай работы да партдня ня было праведзена.** Адсюль і «якасьць» сходу.

Калі ўжо быў абвешчан парадак дня сакратар ячэйкі рантам схамянуў ся: «А хто даклядчык»?

— Вядома хто, ты, як сакратар, павінен даклядваць.

— Ах, што-б табе... І забыўся...

— Стой, не хвалюйся, я цябе выручу—супакоіў Іванова член бюро **Пілсаў.**

Ёсьць. Дагаварыліся.

Відэсаў становіцца ў дзелавую позу і робіць даклад, які быў запоўнен вадалействам.

Ні адзінага канкрэтнага прыкладу, ні аднаго прозьвішча, нічога, што характарызавала-б работу камсамольскай арганізацыі. Ні аднэй канкрэтнай задачы. Даклад быў скончан на тым, што «ўздым ураджайнасьці таксама ня менш важная задача».

У каго ёсьць пытаньні? Няма? Усё ясна!

Але па сходзе якраз прысутнічаў арганізатар РК КСМ тав. **Каган,** які пачаў высоўваць з свайго блёк-ноту бясконцую колькасьць пытаньняў.

Першае—хто быў партпрымацаваны да гэтага часу?

Шукалі доўга, але ўсё-ж такі нарэшце пехта прыпомніў прозьвішча партпрымацаванага—Хомічыка.

Ну і што-ж, быў цяпер няма.

Лепш прыступіць да спрэчак. Слова атрымаў **Вайнэр.**

— Калі ў нас ня будзе культуры, калі ў нас ня будзе ведаў... і найшлі развлажальні «наогул і цалкам».

Дурандзін—былы сакратар партячэйкі гаворыць у наступным «стылі»: Камсамол павінен мабілізаваць мазу... Камсамолец павінен ад'язьні пачэн адчуваць, што ён камсамолец. Мы павінны расьці, а ня то што...

Пытаньне было закончана прынцыпам розалоцы на 15 пунктаў.

За 15 мінут наступны даклядчык ладзіў, выйшлі пленуму.

Многія з прысутных на сходзе калгаснікаў ужо накіраваліся да выхаду.

— Таварышы, сход яшчэ не закрыўся, пачакайце...

— Няма калі, ноўнач ужо, спаць трэба...

Даклядчык знайшоў выхад: У вас ёсьць гурток, дык вы распрацуйце вы яны пленуму там. (Дарэчы гурток існуе на паперы).

І гэта пытаньне завяршылася ўсенагульнай рэзалюцыяй.

Сход, які мы апісвалі, паказвае, што Міхалеўская ячэйка недаацэньвае значэньня партдня, ня рыхтуецца да яго і праводзіць у парадку самацёку.

П. АРЦЕЛЬНЫ.

Г. Бабруйск.

Усесаюзны рэйд „лёгкай кавалерыі"

Слова за пракуратурай

Уноч з 5 на 6 лютага «лёгкай кавалерыяй» — брыгадамі «Комсомольской правды» і ЦКК-РСІ БССР быў праведзен першы рэйд-налёт на жулікаў, раскрадальнікаў, самаспажэнцаў у каапэрацыйных крамах і сталоўках. У гэту-ж ноч «лёгкая кавалерыя» правяраула становішча аховы складаў і пакгаўзаў г. Менску. Вось што выявіў рэйд.

* * *

Ноч ахутвае горад. Пройдзе яшчэ гадзіна-дзьве і засьне працоўны Менск. Апошнія пазушцы імкнуцца пакінуць крамы і разьмеркавальнікі ЦРК і Белгандлю. Сьпяшаюцца і каапэрацыі. Падліўаюцца апошнія чэкі. Зачыняюцца сталоўкі вокнаў і вітрын. Наступае час для дзейнасьці двухгоўных каапэрацыйных «пашуковуў», якія спэцыялізуюцца па «ўпрусцы» і «ўсупцы» рабочых фондаў. Нахабна і адкрыта дзейнічаюць «пашукі». Загадзя падрыхтаваўшы партфэлі і сумкі запаўняюцца дэфіцытнымі таварамі і харчамі.

Доўга ўдавалася ім беспакарана напаўняць запасы хатніх «закрытых разьмеркавальнікаў». Але вось у цёмную лютаўскую ноч «лёгкія кавалерысты» крыкнулі ім: «стой». Спалохаліся аматары «ўсупак». Успомнілі аб законе супроць раскрадальнікаў сацыялістычнай маемасьці. Адны імкнуліся апраўдацца, даказаць, што «мы бядзем пакрысе, па норме», іншыя пагадвалі, патрабавалі дакумантаў на права праверкі, пагражалі міліцыяй і кантрольнымі органамі, і, нарэшце, збавіўшы імпэту, прасілі «кавалерыстаў» адпусьціць іх дамоў.

* * *

Маленькая «кавалерыстка» Рольбіна прыняла вялізнага рыжага дзядзю. Ён нязгрэбна пераступаў з нагі на нагу і цісьціці хаваў за сьпіной.

«Рыбка... тухлая»,—пазразумела мігмытаў ён, — на кнідзы атрымаў. Слоіка тонару...

Пад вартай «кавалерыстаў» пасьмела працікуцаася праз дзьверы хударлявая постаць у старым запмальцаваным паліце. Рыжы дзядзя — гэта прыдзячык 5-га разьмеркавальніка МЦРК **Лсэін.** Хударлявая постаць — загадчык тэй-жа крамы **Рыер.** Яны былі затрыманы з рыбай пасьля закрыцьця крамы.

— Падзялілі астачу па два кілё на брата, — прызнаўся загадчык. — Дай рыба тухлая тухлая.

Рыба была добрай. Дарэмна змкнуліся самаспажэнцы ашукаць брыгаду. Назваўшы сьвежую рыбу тухлай, самаспажэнцы сьледзілі старой прывычкі — за ўзятае не плацілі, і не плацілі...

Рыер злоўлен ужо ня першы раз. Яшчэ ў лістападзе мінулага году ЦКК-РСІ вынесла яму суровую вымову за рад антыпартыйных учынкаў. ЦКК паставіла зьняць Рыера з работы ў каапэрацыі і перагледзець увесь склад работнікаў разьмеркавальніка. Аднак, ЦКК чамусьці забылася пра справу Рыера, ня прыслала пастановы ў парт'ячэйку МЦРК. А сакратар парт'ячэйкі, які прысутнічаў на пасяджэньні ЦКК і ведаў аб пастанове, утаіў, прысылі пратакулу. Рыер-жа, як і раней, займаўся самаспажэньнем, адпускаў работнікам крамы падвойныя пайкі і, паводле дадзёка пяноўных дачых, растраціў каля 800 руб.

* * *

Прадаўшчыцы разьмеркавальніка № 3 Белгандлю **Гінзбург і Язьвіцкая** «гутам і ў раздроб» расьцягвалі прадукты і прэмтавары. «Кавалерыст» затрымаў Гінзбург в кілё пернікаў. Язьвіцкую — з пакункам цукерак. Усё гэта было атрымана без талёнаў і без запісу ў кніжку.

— Вірам пакрысе, па меры патрэбы. — прызналіся прадаўшчыцы.

Бралі ня толькі прадаўшчыцы. Пакіньку займалася самаспажэньнем і касірша разьмеркавальніка — яна таксама без кніжкі, без талёнаў брала галёшы і інш. тавары.

Дый як ня браць! Цры такім добрым загадчыку, як т. **Балчартон,** і сьвяты ня вытрымае і возьме кілё другое.

Тав. Балчартон так і гаворыць: «нічога страшнага няма ў тым, што прадаўшчыцы бяруць пармаваныя прадукты і тавары. Галоўнае, каб яны ня ўтойвалі ад мяне, ня бралі пацікеньку».

У разьмеркавальніку да апошняга дня існавала своячасовае разьмеркаваньне працы. Калі адны цягнулі па прудбачны. дык другія спэцыялізаваліся на расцягваньні прадуктаў па «цагліначцы».

Пры дапамозе службовых запісак, работнік праўленьня Белгандлю, пачынаючы ад дырэктара Белгандлю тав. **Трыфсіка** і канчаючы сакратаром парт'ячэйкі **Іофэ,** «разпружалі» разьмеркавальнік № 3.

— Запісак мы атрымліваем в праўленьня Белгандлю цэлыя горы,—прося 50), але ў гэтым няма вялікай каштоўнасьці. Скажам толькі, што службовыя запіскі — «фомкі» выцягвалі чакаладу, дровы, прымусы, абутак, жаночую бялізну, пальты і нават... партэйцы № 64.

Акрамя Кантона, в ЦКК павінны пазнаёміцца і сакратар ячэйкі Белгандлю т. **Іофэ** і адказны работнік Нар. камгасабу БССР т. **Барсар** (у мінулым работнік Белгандлю).

Барсар ня пакуе за «дробязямі», як Іофэ. Барсар — чалавек вялікіх маштабаў. Ён піша ў першы разьмеркавальнік: «Адпусьціць прад'яўніку гэтага 2 шары мужчынскай бялізны, 2 пт. ручнікаў, 1 палотэку, 2 дзяц. чэры, паркалю або бязі 10 мэтраў». Запіска Барсара апрацуна з галавы да ног таго, хто атрымаў яе.

Барсар падтрымлівае цесную сувязь з дырэктарам Камбанку **Каменштэйнам.** Па запісцы Барсара Каменштэйн атрымаў у 1-м разьмеркавальніку 10 клг. пшанічнай мукі, 2 клг. масла, 2 клг. рысу і г. д.

Клапоціцца Барсар і аб пматлікіх упаўнаважаных, якія прыязджаюць з цэнтру. Упаўнаважаны Наркамгосту т. **Цішчэнка** атрымаў 3 клг. мукі, 2 клг. круп, 3 клг. селядцоў, 1 клг. масла, столькі-ж сыру, 2 дзесяткі яек, 1 клг. пернікаў, 50 грам чаю, 5 пачак папырос і віна «для патрэбы» (літаральна).

* * *

Спрэчкі былі нуда схалястычнымі. Што важней — замкі ці людзі? Што надзейней — добры вартаўнік, ці добры замок? Спрэчкі «кавалерысты» вырашылі на складах. Роўна а 12 гадзіне ночы захапіўшы на кароткі запалак, на кавалку сургуча, крукамі накіраваліся «кавалерысты» на праверку аховы складаў каапэрацыі. Белгандлю і заводаў. Яны шоўсалі па сьцепах, праклялі праз праклёны платэў, лезьлі ў падваротні і ўстанавілі: **менскія склады можна без асаблівых труднасьцяй, бяз шуму ў адну ноч вывезьці разам з вартаўнікамі.** Сыстэма безадказнасьці і паплюваньскіх адносін да сацыялістычнай маемасьці знайшла на складах добрую глебу.

Спаў на таўчане ў часе рэйду вартаўнік складу Камунспабу **Нарэйка.** Удзельнікі налёту знадворку запёрлі вартаўніка, абматалі дротам запор, перавязалі ўсе замкі складу, пачалі выкатваць на вуліцы другі бочкі, а вартаўнік спаў. Толькі пасьля таго, як а прукатам выкацілася на вуліцу жалезная бочка, Нарэйка прачуўся.

Цэнтральны склад МЦРК на першы погляд нагадвае непрыступную крэпасьць. Праз плот складу ня перасочыш. Удзельнікі рэйду пралезьлі праз падваротню. Адзін адчыніў калітку, а другія з шумам ўварваліся ў двор. Не сьпяшаючыся, выпаў вартаўнік з буды, абышкана агледзеў адарытую калітку і спакойна запытаў: «Чаго прыйшлі?»

— Зьмена прыйшла. — адказалі «кавалерысты».

— А... — заўважыў вартаўнік і спакойна пайшоў у будку. А ўдзельнікі рэйду, не сьпяшаючыся, пачалі апячатваць склады. Зрабілі сваю справу, склалі акт і пайшлі.

Спакойна спаў усю ноч і вартаўнік тэлупчавага складу МГРК на вул. Лекерта, 16—**Васілеўскі.**

У любы час, без праверкі дакумантаў, упускае ў цэх пэнжэрны лютэрканай фабрыкі на вул. Лекерта.

Галярэя каапэрацыйных жулікаў і гульбаёў на гэтым ня скончана. Мы расказалі толькі аб некаторай частцы «цёплай кампаніі». Алеі і сканчала на, мі даволі, каб падказаць, што в аховай грамадзкай маемасьці ў нашых каапэрацыйных арганізацыях справа стаіць дрэнна, вельмі дрэнна.

Пралетарская грамадзкасьць павінна сказаць сваё слова.

Сяргей Журыцілаў

Як па маслу...

Малюнак Вал. Мядзьведзева.

Х. Дунец

БОЛЬШ КЛЯСАВАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ

(Некалькі заўваг аб яўрэйскай літаратуры да 1-га пашыранага пленуму аргкамітэту ССП БССР).

Яўрэйская пролетарская культура мае залежкі посьпехі. Аб гэтым сьведчаць вялізарныя дасягненьні ў галіне літаратуры і мастацтва. За апошнія гады група пролетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў БССР дала цэлы рад капітальных высокакласных твораў. Паэтам **Харыкам** выдана ўжо стаўная папулярная серод мас паэма «Непрарыўны тэлеграф», якая зьяўляецца моцнай песьняй аб сацыялістычнай перабудове Савецкай Беларусі. Напісаў кнігу аб праблемах сацыялістычнай рэканструкцыі пісьменьнік **Даўгапольскі** (раман «Шэўк»). Выдані свае творы рад складных растучых пісьменьнікаў: **Юдэльсон, Гарцман, Эле Каган, Ліўшыц, Тэйф, Камянецкі, Талапай, А. Каган, Верамыкін, Маўцінскі** і інш. Вырас моцны актыў здольных рабочых ударнікаў: **Дзягцяр, Шэздзін, Кацэвіч, Рэйзін, Еляшкевіч, Бацьвініник** і інш. Мы маем поўны яркі канкрэт на шляху ўключэньня сябе ў рады актыўных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва такіх кваліфікаваных пісьменьнікаў, былых пануглярнай серод мас паэта **Кульбак і Аксельрод.**

Трэба асабліва адзначыць работу яўрэйскіх пісьменьнікаў БССР над вывадненьнем пераклаў беларускай літаратуры на яўрэйскую мову. У выніку гэтага мы маем серыі у пераказе на яўрэйскую мову кнігі і творы **М. Чэрота, А. Александровіча, М. Лынькова, П. Галавача, Крапівы, Бядулі, Чорнага, Броўкі, Лімжноўскага,** маем пераказы вершаў народных паэтаў **Янкі Купалы і Якуба Коласа,** Рыхтуецца да друку анталёгія беларускай паэзіі на яўрэйскай мове. Гэта, бязумоўна, вялізарная зазначэньнем укладам у справу інтэрнацыянальнага выхаваньня мас.

Усё гэта, бязумоўна, заслугі партыі, якая так шмата ўвагі аддае фронту літаратуры і паэзіі і рабоце серод нацыянальнасьцей, у прыватнасьці. Гэта дакажэ найлепш ужыванньне пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурнага.

Другая пяцігодка пачына прыносьці да значнага пагаршэньня ня адзіных ворагаў у нашай краіне. Тому клясавы ворат усё больш сурацьцяцца.

Нацдэмы і бундаўцы, эсэры і сіяністы, пуглісі і спэцыялісты, пацы і рабіны, на маючы магчымасьці дзейнічаць напрамкі, маскуюцца, каб «цікай сапай» напакасьціць рабочай клясе і апраўдаць надзеі замежнай інтэрвэнцыяністкай клікі.

Часам мацёры клясавага ворага на фронце культуры на цяперашнім этапе выкрываюцца несьвядомасьці. У прыватнасьці, мы гэта бачым на прыкладзе апошніх вылазак нацдэмаў і бундаўцаў у нашым друку. Зьяўленьне нацдэмаўскіх твораў Сідаровіча, Нілановіча і Барановых у нашых выдавецтвах, факт надрукаваньня на яўрэйскай мове артыкулу Чарнаўскага, які прасякнут апалягетыкай контр-рэвалюцыйнага бундызму, і г. д., паказваюць, што яшчэ вытрымлівае рэвалюцыйная пільнасьці. У прыватнасьці, трэба прыпаць палітычна памылковым надрукаваньне ў газэце «ЛМ» твору Барановых «Матчын сын», твору, які пропаведуе нацдэмаўскую тэорыю аб адзінстве беларускай нацыі.

Апартуністычна шкодным зьяўляецца погляд, што нацдэмаўскія вылазкі ў літаратуры маюць месца **толькі** серод беларусаў, што гэтых вылазак няма ў культурным будаўніцтве серод нацыянальных меншасьцей, што акты вязьня буржуазнага нацыяналізму нібыта ёсьць «чыста нацыянальна-беларускае» зьявішча.

Рад фактаў, выкрытых за апошні час, гаворыць аб узмацненьні актывізацыі яўрэйскіх нацдэмаў, шавіністаў і наогул антысавецкіх і антыпартыйных элемэнтаў, якія скарыстоўваюць нацыянальную яўрэйскую форму для вароглядзі работы серод яўрэйскіх працоўных мас.

У школах, у навучальных установах мы маем рад фактаў шавіністычна-антысавецкага парадку. Напрыклад, у яўрэйскай ШКМ у м. Шчадрыны серод вучняў былі выступленьні, ганьбуючыя кіраўніцтва партыі. Настаўнікі змазалі гэту справу; серод настаўнікаў ёсьць людзі, зьвязаныя з кулацкім, спэкулянцкім асяродзьдзем. У яўрэйскім сельска-гаспадарчым тэхнікуме Ку расоўшчыны (Менск) выкрыт рад антысавецкіх і шавіністычных вылазак. Студэнт Тэкач, член ячэйкі КСМ, пры чытаньні матар'ялаў лютаўскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), выдзяжаўся з партыі. Эйдзінаў, былы сакратар камсамольскай ячэйкі тэхнікуму распаўсюджваў антысавецкі анэкдот аб савецкай грашовай сыстэме. Камсамолец Рагозін абараняў Ткача пры разгляданьні яго ўчынку на бюро камсамольскага калектыву. Пры адборы студэнтаў у тэхнікум на была зьвернута ўвага на сацыяльны склад. Многія чужыя элементы пралезьлі туды, прадстаўляючы ліпавыя дакумэнты. У складзе студэнтаў ёсьць дзеці пазбаўленых права голасу, асуджаных за спэкуляцыю на 10 год.

Калі зьвернемся да галіны навукі, тэатру, дык і тут мы маем падобныя зьявішчы. Выступленьне Чарнаўскага і інш. з артыкуламі, у якіх дасьцца апалягетыка бундызму-меншавізму, ёсьць форма працягваньня над фальшы ва-нацыянальным сьцягам антыпэнінскай кантрабанды, ёсьць разам з гэтым пераклёна рэшткі яўрэйскай нацдэмаўшчыны ў выкладзе бундызму ў нацдэмаўшчынай беларускай і інш., пера клёна з сацыял-фашыстскім «Бундам» за мяккой.

Яркі факт яўрэйскай шавіністычнай вылазкі меў месца ў яўрэйскай старонцы пмантыражкі віцебскай культурнай фабрыкі. Так, заметка аб нецарадках у школе мае загаловак «Давоці мсьцюць яўрэйскай школе». Там-жа гаворыцца аб тым, што рабочыя фабрыкі ня мецуць заставацца на працрыемствах пасьля работы з-за дрэнна ці забесьпячэньня. Пераклад цытаты т. Сталіна ў адной з заметак гэтай «старонкі» быў скрыўлен свядомы чы нам: вырас т. Сталіна «духоўныя ніці» пераложаны: «ніці духавэнства» і г. д.

Пагоньня зьявішчы мы маем і ў галіне літаратуры. Выдадзены падручнікі па літаратуры для 3-га і 4-га навучальнага году маюць шкодныя творы, надрукаваныя пад відам «скарыстоўваньня яўрэйскіх клясыкаў» (апавяданьне «Мешуцкі»), ня ўключаюць ні аднаго твору беларускай літаратуры (падручнік для 4-га навучальнага году), што яна характарызуе махровую нацыянальную абасобленасьць. Надрукаваная кніжка Лейбмана аб Бера-Нізка не мае фармулёўкі, сказаючыя ленінскую нацыянальную палітыку партыі. Малады яўрэйскі паэт М. Ліўшыц адаў у яўрэйскую радыё-газэту верш «Крыгада ў полі», дзе ёсьць нацдэмаўская ідэалізацыя кулака. На сходзе пісьменьнікоў мы мелі выступленьне паэта Юдэльсона, у якім адчэна станоўчна яўрэйская літаратуры ў БССР дасьцца ў душу нацыяналістычнага максымалізму. (т. Юдэльсон асудзіў гэту сваю ўстаноўку).

Усе гэтыя факты гаворыць аб актывізацыі буржуазна-нацыяналістычных элементаў у яўрэйскай літаратуры, якім те давалася выстарчальнага адпору.

Такім-жа нацдэмаўскія вылазкі, факты крыўцяленьня клясавай пільнасьці маюць месца і ў галіне тэатру і кіно. Толькі нязгасьцю тэндэнцыі аміставаньня яўрэйскага нацыяналізму можна растлумачыць настаноўку ў яўрэйскім Дзяржтэатры БССР п'есы «Гэлуэ» (п'есы ў асноўным карыснай), без вы-яўрэйскіх, бяз выняцьця элемэнтаў шавіністычнага парадку ў музыкальным афармленьні.

Нядаўна быў паказан фільм «Нэйтон Вэкер» выпорчацкі Белдзяржкіно. У гэтым фільме дасьцца шкадлівіцкая абмалёўка савецкага мястэчка ў пачатку першай пяцігодкі. Паказваецца, што у мястэчку адны толькі бесьпрацоўныя яўрэі, выхад мястэчка—гэта выхад насельніцтва пасьля пагрому. Другая частка фільму, якая маюе працу яўрэяў на Магнітабудзе, пагана а ляпрэўкай, ня ўзгучана. Наскул у карціне няма намаку на сацыяльную дыферэнцыацыю серод яўрэйскага насельніцтва. Мястэчковае насельніцтва барацца, як сацыяльная маса бедняцкую. Іменна так яўрэйскія нацыянал-дэмакраты аргументавалі «адзінства яўрэйскай нацыі».

Усё гэта гаворыць аб актывізацыі клясавага ворага, аб неабходнасьці ўзмацненьня клясавай пільнасьці на гэтым участку барацьбы.

* * *

У той час, калі ў Савецкім саюзе і ў БССР, як яго частцы, яўрэйская культура, літаратура і мастацтва ўсё больш разгортваецца, мы бачым зьяўішчаньне ўсякіх адзнак гэтай дзейнасьці ня ў той бок нашых межаў, у капіталістычных краінах. Гэта асабліва ярка вымалёўваецца па фактычным стане яўрэйскай культуры ў фашысцкай Польшчы. Бесьпрацоўе і наўпарыцьцяя яўрэйскіх рабочых і працоўных, антысэмітызм, палітыка «свой да свайго» і інш. «прыгожасьці» фашысцкай палітыкі суправаджаюцца дракоўскімі мерамі супроць культурных начынаньняў серод мас нацменшасьцяй, у прыватнасьці, серод яўрэйскай нацыянальнасьці.

Апалёўны нацдэм, шавініст, сямяка волы бундавец і сяніст, спэкулянт і пьяніца,—усе яны прабуюць дасьць адпор ні бой пераможнаму пролетарыяту. Неабходна мабілізаваць масы супроць гэтага ворага, які дзейнічае пад прыкрыцьцём фальшыва-нацыяналістага сьцягу, які выступае ў ролі «адзінаста» «нацыянальнай палітыкі». Вылазкі гэта га ворага на ідэалёгічным фронце, на фронце літаратуры і мастацтва патрабуюць узмацненьня клясавай пільнасьці, узмацненьня інтэрнацыяналізма вы-хаваньня, выкрыцьця гэтых, вылазак перад шырокімі масамі і змуціваньня мас, згуртаваньня савецкіх пісьменьнікаў і работнікаў мастацтва вакол генэральнай лініі партыі, актываўтаваньня гэтых кадраў у гаспадарча-палітычнае скіцьцё краіны і мабілізацыі іх на сапраўднае створэньне мастабудаў літаратуры і мастацтва.

Неабходна заваструць увагу ўсёй савецкай пісьменьнікай грамадзкасьці на барацьбу з яўрэйскім нацдэмакратызмам, які актывізуецца. Адсюль канкрэтная задача у рабоце яўрэйскай секцыі ССПБ—рашуча змагацца з вылазкамі нацдэмакратычных элемэнтаў, але мэнтаў нацыянальнай абмежаванасьці і абасобленасьці, нацыянальнай прупаўнічыны, з іграўленьнем буржуазнай ба гемпічны. Адсюль патрабаваньне—**узмацніць бальшавіцкую самакрытыку.** Арткамітэт са свайго боку павінен узмацніць кіраўніцтва яўрэйскай секцыяй, часьцей ставіць пытаньні разьвіцьця яўрэйскай літаратуры, уцягнуць усю масу беларускіх савецкіх пісьменьнікаў у кола пытаньняў данай секцыі, узмацняючы інтэрнацыянальную сувязь паміж нацыянальнымі пісьменьнікамі літаратамі—асноўным фронтам савецкай літаратуры БССР.

Неабходна рашуча паазрацуць пісьменьнікую масу да ўдзелу ў гаспадарча-палітычных кампаніях на вёсцы. Прыходзіцца канстатаваць, што яўрэйскія пісьменьнікі ў загатоўчай кампаніі амаль ня прымалі ўдзелу. З гэтага трэба зрабіць неабходныя выводы.

Неабходна таксама ўзмацніць работу яўрэйскіх пісьменьнікаў па перакладу з беларускай і інш. моваў. Адначасова неабходна арганізаваць пераклад твораў лепшых майстраў і рабочых-ударнікаў яўрэйскай савецкай і пралетарскай літаратуры на беларускую мову, бо ўсім недзвушчыцца, калі ДВБ за некалькі год выпусьціла пару чудзенькіх пераклаў з яўрэйскай, а рад кніг для перакладу марыцуецца годамі і ня выдаецца.

Толькі пры правільным ажыцьцяўленьні лініі партыі ў галіне літаратуры яўрэйская літаратура БССР, як арганічная частка ўсёй савецкай літаратуры, якая дасягнула шмат на пройдзеным шляху, зможа тысяч разьвіцьця, перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага і ўсякія яго шкодніцкія спробы.

Беражыце каня!

„Калі мы сур'ёзна змагаемся за павышэньне ўраджайнасьці, за павялічэньне даходнасьці нашых калгасаў, дык трэба цяпер-жа рыхтаваць каня да вясны. Аднымі трактарамі хоць-бы іх было ў нас не паўтараста, а трыста або пяцьсот тысяч у гаспадарцы і іменна вясной працаваць нельга.“

(З адозвы ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў)

Конюх Бакач

Яшчэ амаль ноч—тры гадзіны раніцы. У калгасе імя Карла Маркса цішыня. Варушыцца толькі **БАКАЧ.** У гэту пару яго заўсёды можна знайсьці на стайні з ліхтаром у руках. Бакач—старэйшы конюх калгасу, разам са сваімі памочнікамі Шаўцовым і Дацюбічам, поіць коняй і раздае ім грубыя і канцэнтраваныя кармы. У гэты-ж час ён праводзіць і чыстку коняй.

Да 6 гадзін раніцы коні гатовы да работы. У поўдзень коні зноў поюцца і атрымліваюць сена. Увечары—чарговая порцыя грубых і канцэнтраваных кармоў.

Недарма калгаснікі с.-г. арцелі імя Карла Маркса паставілі старэйшым конюхам былога бедняка, старога калгасніка Нічыпара Бакача. Надзеі калгасу Нічыпар апраўдвае з гонарам. Усе коні добра дагледжаны, няма ні аднаго заморанага, ні аднаго заскалзанага.

Над адказнасьцю Бакача 26 рабочых коняй. Да кожнага каня ў яго асобны падыход. Ён падзяліў усё пагалоўе на дзьве групы—моцных і слабейшых. Моцныя групы ня больш цяжкія работы—вывазку леса і г. д., слабейшыя выкарыстоўваюцца для падвозкі кармоў, дроў і для разьездаў на невялікую адлегласьць.

За адзін дзень конь у калгасе імя Карла Маркса атрымлівае 12 клг. сена, 4 клг. сечкі і кілё канцэнтраваных кармоў. А калі конь ідзе на цяжкую працу, дык яму дабаўляюцца 2 клг. канцэнтраваных кармоў.

У Бакача няма сакрэтаў. Тое, што ведае ён, ведае кожны селянін, які працуе з канём. Але Бакач адрозьніваецца ад іншых калгаснікаў сваёй сумленнасьцю, сваёй адданасьцю калгаснай справе, сваімі сапраўды гаспадарскімі адносінамі да калгаснага каня. На кожнага каня ў яго падагна ны асобны камплект збруі (хамут, сядзёлка, лейцы і г. д.). Замочаны хамут або сядзёлку Бакач бярэ ў хату і прасушвае. Таму і коні не замулены.

У адказ на адозву ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў Бакач уключыўся ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да сяўбы і выклікае ўсіх конюхаў Брушчыны пасьлядаваць яго ініцыятыве.

П. Ч.

Бабруйск, калгас
ім. Карла Маркса.

У трэсьце заняты...

Выключны па сваім зьмесьце факт пядаўна меў месца на шляху з Менску ў сьлядагадоўчы саўгас «**Курганы**». 10 лютага, сярод белага дня, не далёка ад саўгасу пала двое лепшых саўгасных коняй. На іх ехаў п'яны гарэтнік саўгасу «Курганы» **Луб'янкоў** (член партыі).

Выехаўшы ў Менск, ён на працягу сутак не кармеў коняй, а потым разгарачаных іх напаіў. Коні ня вытрымалі, нават да саўгасу не дацягнулі.

Гэта—вынік агіднейшай абязьлічкі, якая панує ў саўгасе «Курганы». На стайні тут распраджаецца хто толькі хоча. Коні не замацаваны за пэўнымі рабочымі. Сёньня па коніх едзе гарэтнік, заўтра кладаўшчык і г. д. Дырэктар саўгасу **Шырко** ведаў пра ганебнае становішча на стайні. Ня мог ён ня ведаць пра гэта, бо нават быў напярэдадні кантролёрам Наркамзему. Ведаў, але-ж ніякіх мер ня прыняў супроць барбарскіх адносін да каня і гэтым спрыяў шкоднікам і гультаём у разбурэньні саўгаснай гаспадаркі. Загадам упаўнаважанага Наркамсаўгасаў дырэктару абвешчана суровая вымова. Луб'янкоў выключан з партыі, зьнят з работы і аддан пад суд.

Але ці паслужыў гэты факт сыгналам для самога кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў, для жывёлагадоўчых трэстаў? У кіраўніцтве ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў пытаньнямі конягадоўлі і падрыхтоўкай коняй да вясны ніхто не займаецца. Ніхто за гэту справу пэрсанальна не адказвае.

— Бачыце, пасада такая ёсьць, але няма каму даручыць справу, — вось адказ намесьніка ўпаўнаважанага тав. **Аўчынынікава.**

На пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да вясны кіраўніцтва Упаўнаркамсаўгасаў ніяк не рэагавала, ніякіх практычных захадаў ня ўжыло.

У менскім **сьвінагадоўчым трэсьце** дырэктыву партыі і ўраду таксама малавалі 10 дзён.

Матывы:

— Ня было грошай, каб купіць папіры і перадрукаваць пастанову СНК і ЦК,—заяўляе сакратар трэсту. Заява гаворыць сама за сябе...

Між тым пагражаючае становішча з цягавай сілай ня толькі ў саўгасе «Курганы». У саўгасе «**Вызваленьне**» з 62 коняй 32 выбылі са строю. Старэйшым конюхам тут пралез былы заможнік, брат бандыта, **Івановіч**, які займаўся простым шкодніцтвам. Дрэнна і ў саўгасе «**Пяцігодка**» і ў радзе іншых.

Да вясны саўгасы менскага сьпіртаводтрэсту павінны перавезьці **звыш** 8.000 тон розных грузаў, у тым ліку пасеньне, угнаеньні і кармы. Адсюль зусім зразумела, якое значэньне для саўгасу мае правільнае скарыстаньне конскай цягавай сілы, правільны догляд коняй зараз, у прадвеснавую пад рыхтоўку.

Толькі тры дні назад гэты трэст, на рэшце, разаслаў дырэктыву саўгасам, але ні адным словам нават ня ўспомніў пра дні адпачынку каня, ні слова не сказаў аб пляновым скарыстаньні конскай сілы. І гэта пасьля пастановы СНК і ЦК!

Тут нават хворае месца,—прызнаецца намесьнік дырэктара трэсту тав. **Гарыленкаў** адказны за падрыхтоўку да вясны..—Такога пляну няма ў самым трэсьце.

Абыйшлі моўчкі і прымацаваньне за кожным конюхом ня больш 10 коняй, што чорным на белым паказана ў пастанове ЦК і СНК.

Дырэктар трэсту тав. **Жук** апраўдваецца тым, што аб гэтым гаворыцца ў пастанове СНК і ЦК. «Навошта-ж нам паўтараць?»

У менскім **малакопрамтрэсьце** атрыманы весткі з некаторых саўгасаў аб правядзеньні ўсесаюзнага дня каня. З 39 саўгасаў весткі даслалі толькі 7. У саўгасе «**Капацзвічы**», напрыклад, старэйшы конюх **Сушко** давёў коняй да такога становішча, што палова іх ня ўстае. Ня лепш у саўгасе «Спяжнутова» і інш. Усе гэтыя факты з саўгасаў работнік **Наздрын,** адказны за падрыхтоўку каня да вясны, склаў у папку. Ніякіх мер супроць шкоднікаў дырэкцыя трэсту ня прыняла. На пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР тут таксама не адгукнуліся.

— Ня мелі часу, надта заняты,—адкрыта прызнаецца Наздрын.

Што «заняты»—гэта праўда, толькі чым? Ва ўсякім выпадку пэ падрыхтоўкай конскага пагалоўя да вясны.

І. П.

Тактыка ворага

Кучаруўскі не памыліўся... Воўк у аветай скуры добра ведаў, чым можна нашкодзіць больш шкоды калгаснай гаспадарцы. Кулак, пралезшы ў калгас, выбраў аб'ектам свайго шкодніцтва калгасных коняй.

Вораг дзейнічаў ціхай сапай, прыбраўшы да сваіх рук калгасную стайню. І адтуль паціхеньку імкнуўся падарваць калгасную гаспадарку. Яго тактыкай было—давесьці коняй да такога стану, каб калгас апынуўся бяз цягавай сілы. І вораг ня спаў. Кулак Кучаруўскі, прабраўшыся ў калгас імя Дзяржынскага (Менскі раён), так, з дазволу сказаць, дагледжваў калгасных коняй, што яны рабіліся нікуды нявартымі. Кучаруўскі, калі трэба было падкармліваць коняй, запчыў цьвікі проста ў жывое мяса. Коні падалі...

Калгаснікі выкрылі махінацыі кляса ворага. Кучаруўскі выгнан з калгасу. Дзяржынцы не абмежаваліся толькі гэтым. Яны арганізавалі пільны і падзейны дагляд калгаснага каня. Коняй перадалі ў сілі выпрабаваных людзей, адданых справе калгаснай гаспадаркі. Калгас уважліва прыглядзеўся да тых, хто хадзіў за коньмі. І аказалася, што ў Кучаруўскага было шмат памочнікаў. Пасобныя конюхі злачынна адносіліся да коняй. Коні ў іх былі зьдзёўшы замулены.

Выкрыўшы гэта кулацкае ахвясьце, калгаснікі с.-г. арцелі імя Дзяржынскага па-баявому ўзяліся за падрыхтоўку коняй да вясновай пасеўнай кампаніі. І вось вынікі.

У калгасе 40 коняй. Усе яны разьбіты на дзьве групы—здаравейшых і слабейшых коняй. Першых—26, другіх—14. Ёсьць таксама 7 матак. Конскае стада бязупынна аднаўляецца. Зараз калгас выгадаваў 4 новых коняй. Усе коні прымацаваны да брыгад і пасобных калгаснікаў. Да палявой брыгады—большасьць коняй, да таварнай—меншая колькасьць. Коні кормяцца ў залежнасьці ад патрэбы. Першая група атрымлівае ў дзень на кілё аўса, 1,5 клг. вотрубяй, 8 клг. сена, бульбы і г. д.

Усе коні маюць добры і спраўны выгляд. Ні замуленых, ні заскіданых няма. Конюх калгасу—Трушкевіч Мікась і брыгадзір палявой брыгады Шабуневіч самаадана дагледваюць коняй. Збруя, вупраж—усё падагнана. Калгас імя Дзяржынскага па-баявому рыхтуе сваю конную сілу да вясны.

Ц—ш.

СЭКТАР, ЯКІ ЗГУБІЎСЯ...

Калі-б у наркома земляробства БССР тав. **Рачыцкага** зараз запытаць, на якім паверсе і ў якім пакоі знаходзіцца той ці іншы аспэкт сэктар наракаматаў, ён-бы затрудніўся адказаць.

І ня дзіва. Вось ужо некалькі месяцаў, як Наркамзем БССР знаходзіцца ў стадыі бесьперапыннай «рэарганізацыі», правільней кажучы, бесьперапынных пераездаў з другога паверху на трэці, з трэцяга на другі, з пакою ў пакой, і так без канца.

Напрыклад, бюро севазвароту за гэты час ужо знаходзілася ў трох пакоях, сэктар вэтэрынарыі пераяжджаў ужо два разы, тое-ж самае і з сэктарам уліку.

Адным словам, зараз, у самыя гарачыя дні падрыхтоўкі да вясновай пасеўнай кампаніі, людзі настолькі займаюцца практычнай работай, колькі пераяжджаюць з аднаго месца на другое.

Пад шумок гэтай мітусьні і бясконцых пераездаў у Наркамземе, так сказаць, згубіўся **СЭКТАР КАНЯГАДОЎЛІ.** Ня будзем галаслоўнымі.

У мінулым годзе гэтым пытаньнем у Наркамземе займаўся адзін чалавек, спэцыяліст-канявод **Рагуля.** Нічога канкрэтнага на аднаўленьні і ўмацаваньні конскага пагалоўя гэты канявод не зрабіў. Ён настолькі закапаўся ў розныя паперкі і цыркуляры, што мякка кажучы, не заўважыў тых згід гасьцяй і барбарскіх шкодніцкіх адносін да каня, якія мелі месца ў радзе фэрм, лепшых конюхаў і г. д. На скліканьне канфэрэнцыі затрацілі кругленькую суму ў 10.842 руб. Канфэрэнцыя вызначыла рад важнейшых мерапрыемстваў па захаваньні і аднаўленьні конскага пагалоўя. Ну, а практычныя вынікі?

Якая там тутарка можа ісьці пра практычныя вынікі, калі і па сёньняшні дзень ніхто ў раёнах ня ведае аб вынніках гэтай канфэрэнцыі. Пастановы канфэрэнцыі і да гэтага часу ляжаць у кішэні былога загадчыка вэтэрынарнага сэктару НКЗ БССР **Грузакова.**

Фактаў даволі. Ня дзіва, што пры такой абстаноўцы безадказнасьці і абязьлічкі прыпчэпаўскае, падпэмаўскае ахвясьце, якое прабралася ў апарат Наркамзему, на працягу пэўнага часу магло беспакарана праводзіць сваё контр-рэвалюцыйнае шкодніцтва.

Кіраўніцтва справай Канягадоўлі ў Наркамземе БССР абязьлічана і закінута. Калегія НКЗ БССР праявіла ніякі лібэралізм да тых бязьдзейнікаў і дэзарганізатараў з Каняводаб'яднаньня, якія падмяняюць практычную работу па падрыхтоўцы коняй да сяўбы бюракратычнай і бескарыснай балбатнёй.

Калегія Наркамзему замест таго, каб неадкладна забясьпечыць практычнае ажыцьцяўленьне пастановы СНК і ЦК аб конях, адводзіць цэлыя дэкады на вывучэньне таго, чым павінны займацца работнікі Наркамзему.

Нішто сабе апэрацыйнасьць!..

ЗОРЫН.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» сподзяецца, што калегія НК РСІ БССР ужыве рашучыя захады па сутнасьці пытаньняў, узьнятых у даным артыкуле.

„ПАДАРОЖНЫЯ ВЫДАТКІ“ НАРКАМЗЕМУ

Мал. Вал. Мядзьведзева



Множыць поыклад калгасу „Юны сьвет“

Калгас «**Юны сьвет**»—адзін з тых калгасаў у Дрысенскім раёне, якія пабальшавіцку змагаюцца за здаровага і моцнага каня, практычна ажыцьцяўляючы пастановы партыі і ўраду аб разьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя.

Усяго ў калгасе 80 коняй. Усе яны разьбіты на групы па ўзросту і годнасьці, стаяць у спэцыяльна пабудаваных стайнях. Племянныя жарабы і маткі знаходзяцца ў прасторных стайнях; у стайнях чыста і сьветла. Кожны дзень кладзецца падсьцілка. Рогулярна праз два-тры дні коні чысьцяцца. Кормяць іх па нормах, вызначаных асобна для рабочых коняй, маладняка і племячых. Кормяць і поюць коняй у строга вызначаныя гадзіны.

Лепшыя ўдарнікі калгасу, конюх **Курыленак і Машкевіч** адзін і ўночы наглядаюць за коньмі. Аддана працуе Снапок Васіль (камсамолец), які важыць корм.

Ня дзіва, што ў калгасе «Юны сьвет» коні сытыя, гладкія, каўчучы словамі саміх калгаснікаў: «хоць сёньня выводзь на выстаўку».

Але не на выстаўку калгаснікі «Юнага сьвету» рыхтуюць сваіх коняй. Яны ўпарта змагаюцца за моцную цягавую сілу да вясновай сяўбы. І той факт, што зараз, калі калгас штодзенна накіроўвае па 15 фурманак на лесавывазку, і коні, ня гледзячы на дрэнную дарогу і цяжкую працу, свайго добрага выгляду ня страцілі, сьведчыць аб тым, што калгаснікі спраўды па-гаспадарску адносяцца да цягавай сілы.

Паказвае добры прыклад у догляде коняй і конюх калгасу «Надзея», Лупачарскага сельсавету, т. **Грэцкі Пятро.** Ён-былы батрак, уступіў у калгас з 1928 году. З гэтага-ж самага часу т. Грэцкі працуе конюхам, дагледае 19 коняй.

У яго стайні ўзорны парадак, чыста та. Гной з пад коняй выбіраецца кожны дзень і праходы пасыпаюцца жоўтым пяском.

Зараз на раёне абвешчан унутрыраённы конкурс на лепшага конюха. Першым у конкурс уключыўся калгас імя **КАЛІНІНА,** Вальнецкага сельсавету, дзе ёсьць капягадоўчая ферма.

Раней на стайні тут панавала абязьлічка, коняй дрэнна дагледалі. Зараз становішча тут рэзка зьмянілася. Паміж конюхамі разгарнулася спаборніцтва на лепшае захаваньне каня, на лепшую падрыхтоўку да вясны. Коні добра дагледаюцца.

М.

„Шляпы“ з Гарадка...

ГАРАДОК. (Наш кар.).

Ідзем у райза пацікавіцца становішчам конскага стада ў калгасах і саўгасах раёну. Як тут адносяцца да выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб аднаўленьні і разьвіцьці конягадоўлі.

Адказны работнік па конягадоўлі **Паўлаў заяўляе:** «Колькі коняй па раёне—ня ведаю, такога ўліку ў райза няма. Які прыклад—таксама ня ведаю». На запытаньне, колькі жаробных матак, жарабцоў, прозьвішчы конюхаў у калгасах, сьледуе адзін і той-жа адказ: ня ведаю.

— Чаму-ж вы ня цікавіцеся становішчам калгаснай стайні? Вы-ж адказны за становішча конягадоўлі ў раёне.

— Бачыце, я чалавек новы, — адказвае Паўлаў. — Працую ў райза з 1 студзеня і толькі гэтымі днямі мне намесьнік загадчыка райза т. **Бутвілові**ч перадаў справы на конягадоўлі. Я фактычна быў на ільнозагатоўках у Вышацкім і Кабішчанскім сельсаветах, так што не працаваў.

— А што-ж вы зрабілі для паляпшэньня справы конягадоўлі ў Кабішчанскім сельсавеце, па падрыхтоўцы каня да сяўбы?

Чырванее Паўлаў. Пытаньне трапіла ня ў брыво, а ў вока. Ня ведае куды дзецца. Круціцца Паўлаў на крэсьле і адказаць ня можа, нібы язык адняўся.

І сядзіць гэты чалавек, член партыі, у канцылярыі райза «і самаздаволена рыпіць пяром», кіруе конягадоўляй больш як у 200 калгасах аднаго з буйнейшых раёнаў Беларусі. І ня ведаюць ні Паўлаў, ні кіраўнік райза т. **Шнэйдар,** як у калгасах раёну гадуецца конь, як яго дагледаюць.

Адарванасьць райза ад калгасаў, ня кажучы ўжо аб калгасных стайнях, скарыстаў пралезшы ў пасобныя калгасы клясавы вораг і робіць там сваю шкодную справу. Факты красамоўней слоў. Возьмем найбольш характэрныя.

У калгасе «**Праўда**», Канчанскага сельсавету, з абагуленых 20 коняй зараз ёсьць толькі 15. Куды-ж дзеліся коні? Асэбін конь загінуў з-за таго, што па ім паехалі па ільду не падкаваўшы.

Другі быў заезджаны і загінуў.

Трое коняй з-за дрэнніцкіх да іх адносін ляжаць.

Кабыліц ні разу ня злучалі.

Зараз астатнія 15 коняй заезджаны да таго, што ні на адным з іх нельга даехаць да раённага цэнтру (на адлегласьці 20 кілёмэтраў), каб яны ня прысталі ў дарозе.

У чым-жа справа. Мабыць коні дрэнныя, старыя? Не, ня гэта. Справа ў людзях. Людзі-ж, пралезшы сюды ў калгас, — былыя цьвёрдазаданьнікі, якія разбураюць калгас з сярэдзіны. Яны пачалі з таго, што лепшыя кавалкі сенажаці касілі для сябе, а больш горшыя ,як-та балотныя сенажаці, касілі для абагуленай жывёлы. Касілі позна. Сыраватае сена вазілі ў пуні. Яно там нагарэла і зараз коні яго не ядуць. Мяшаць гэтага сена няма з чым, бо добрае сено ўжываюць для ўласных кароў, а яно для абагуленай жывёлы. Апрача таго, 6,5 га сенажаці ў калгасе засталося нескошаным.

Пралезшы ў праўленьне калгасу цьвёрдазаданьнік **Палякоў Іван,** прызначаны брыгадзірам, праводзіў такую кулацкую палітыку. Нібы жадаючы дадць усім зарабіць, больш выпрацаваць працадзён, ён увёў дзяжурствы па догляду коняй па чарзе і такім чынам стварыў умовы для дрэнніцкіх адносін да каня, каб нельга было знайсьці вінаватага. У школьніцкай рабоце яму дапамагаў старшыня калгасу **Іваноў** — моцны заможнік, ён ўступіў у калгас, каб схавацца ад цьвёрдага заданьня. І коням ад іх ні паздаровілася.

У калгасе «Серп і молат», гэта га-ж сельсавету, дзе брыгадзірам быў кулак **Чарняўскі,** 40 коняй зморана яны ледзь трымаюцца на нагах. Сваі шкодніцтва ён праводзіў рознымі мэтадамі. Да пачатку зімы круглыя сутакі коні заставаліся на полі, у выніку чаго ў коняй прастуджаны ногі.

Далей шкодніцтва пайшло па лініі кармленьня. Кармілі мёрзлай бульбай буракамі, давалі адразу па два вядры мёрзлага турнэпсу кожнаму каню. Ад такога корму ва ўсіх коняй расстройства страўніка, яны захварэлі інфлюэнцыяй, здаровыя ня былі аддзелены ад хворых і таму ўсе захварэлі. Гэтаму яшчэ спрыяла і тое, што стайня не ацеплена, нагляд за коньмі быў даручан хлапчыкам школьнага ўзросту. У 10 кабыліц былі выкідышы.

Кулацкі шкоднік, контр-рэвалюцыянэр Чарняўскі арыштаван. Рука пралетарскай дыктатуры бязьлітасна яго пакарае. Але дзе-ж была ячэйка на чале з сакратаром **Емельянавым?** Няўжо нельга было самім сваячасова выявіць гэта на месцы, не дапусьціўшы зьнішчэньня конскага стада. Тут кляса вая пільнасьць была страчана, бо ў калгасныя стайні ніхто не зазіраў.

У калгасе імя Чарнякова, таго-ж сельсавету, дзе ёсьць тры кандыдаты партыі, адказны за коняй кандыдат партыі **Савенкаў** дапусьціў, што лепшых коняй заезьдзілі, двух коняй прадалі па ўбой толькі таму, што іх «вельмі цяжка злавіць у полі з пасьбішча». Догляд коняй дрэнны, адначыпак для іх не ўстаноўлен, коні абязьлічаны.

Дрэнніцкія і злачынныя адносіны да каня праяўлены і ў калгасе **імя Варашылава,** Пралетарскага сельсавету. Усяго ёсьць у гэтым калгасе 19 коняй, з іх пакалечана 14.

Дзьве жарэбныя кабылы ад непосільных нагрузак мелі выкідышы. 10 коняй стаяць са збітымі сьпінамі. Да іх ня былі падагнаны хамуты кожны раз пры паездцы для каня браўся абы які хамут, ня цікавіліся тым, падыходзіць ён ці не. Канкрэтных вінаватых ніхто не знаходзіць. Вось плёны абязьлічкі, што ніколькі ня турбуе ні райком партыі, ні РВК, ні райпракурора.

Майская пастанова СНК аб разьвіцьці конягадоўлі ня стала баявой праграмай дзеяньняў. Яна падышла да справы, аб ёй у калгасах нічога не ведаюць, да калгаснікаў яе не давялі і ажыцьцяўленьня яе не правяралі.

Нарады старшынь калгасаў, калгасных конюхаў, загадчыкаў КТФ не праводзены. Хто гадуе вытворнікаў—Паўлаў ня ведае. Ні ў адным сельсавеце да гэтага часу ня вылучаны адказныя па конягадоўлі.

Разьвіцьцё конягадоўлі ў раёне ідзе самацёкам, а «самацёк цяпер, больш чым калі небудзь, зьяўляецца шкодным для справы разьвіцьця сельскай гаспадаркі, самацёк цяпер можа нагубіць усю справу» (Сталін). Гэтага пакуль што не зразумелі раённыя арганізацыі Гарадоцкіншчыны.

Р. ВЯРХОЎСКІ.

Лібэральны пракурор

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). У пастанове аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да вясновай сяўбы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР запісалі:

«Прапанаваць мясцовым органам улады не пакідаць без расьсьледваньня ні аднаго выпадку падзяжу рабочай жывёлы і прыцягваць вінаватых у падзяжы да суровай адказнасьці». У гэтай-жа пастанове прапанавана пракуратуры ўзмацніць нагляд за выкананьнем пастановы ЦВК і СНК СССР аб разьвіцьці і захаваньні конскага пагалоўя ад 27 мая.

13-га лютага раённая газэта «**Камунар Магілеўшчыны**» зьмясьціла рад карэспандэнцкі аб шкодніцкіх адносінах да конскай цягавай сілы ў ў пасобных калгасах. У калгасе імя 1-га мая, Таранаўскага сельсавету, большая частка коняй выведзена са строю, з прычыны барбарскіх адносін да іх з боку конюхаў і брыгадзіраў.

Магілеўская пракуратура замест таго, каб адразу прыняць належныя меры супроць вінаватых, абмежавалася адпіскай: «Магілеўскаму райземадзелу па расьсьледваньне. Пракурор Гінзбург».

Вось і ўсё...

Па Гінзбургу раўнуюцца і цекатоны судзьдзі. Факты лібэральнічаньня з кулацкімі і іншымі шкодніцкімі элементамі з боку магілеўскіх судовых работнікаў можна памножыць. Напрыклад, у калгасе «**Шлях да сацыялізму**», Хрышчэўскага сельсавету, кулак **Квяткоўскі,** будучы конюхам, прывёў коняў у негод пасьць. Судзьдзя **Аркахоўскі,** які раз глядаў гэту справу, прыгаварыў кулака Квяткоўскага да 6 месяцаў прымусовых работ, але, прыняўшы пад увагу яго «пасьвядомасьць і чыстасардэчнае прызнаньне», замяніў пакаранньне ўмоўным.

Справы аб шкодніцкіх адносінах да каня пракуратура і сьледчыя органы Магілеўшчыны зацягваюць на некалькі месяцаў. Напрыклад, справа аб прапажы племянной кабылы ў калгасе **імя Сталіна**, пачатая 28 кастрычніка, яшчэ ня скончана.

Пракурор раёну Гінзбург лічыць гэта звычайным зьявішчам і апраўдвае мяккацелаасьць судзьдзяў тым, што яны, маў, заняты на загатоўках. Прыгаворы парсуда, аб якіх мы ўказалі вышэй, пракурорам не апратэставаны.

Н. Нэйлін.

Прывітаньне т. Літвінава Чырвонай арміі

ЖЭНЭВА. (ТАСС). Народны камісар замежных спраў тав. Літвінаў накіраваў наступную прывітальную тэлеграму тав. Варашылаву з прычыны 15-годзьдзя Чырвонай арміі.

«Рэвваенсавет Варашылаву.

Савецкая дэлегацыя канфэрэнцыі па раззбраеньні далучаецца да прывітаньняў партыйных і савецкіх арганізацый слаўнай Чырвонай арміі ў дзень яе 15-годзьдзя. Запрошаная для супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі ў справе ліквідыцыі і ажыцьцяўленьня раззбраеньня, савецкая дэлегацыя ўнесла рад прапаноў, як аб поўным раззбраеньні ці максымальным скарачэньні ўзбраеньняў, так і аб іншых сродках забесьпячэньня міру. Пасьля шасьці год актыўнай работы ў Жэнэве, савецкая дэлегацыя вымушана, на жаль, канстатаваць, што капіталістычныя дзяржавы **не зрабілі ні аднаго кроку насустрач яе прапановам і з свайго боку ня высунулі ніякіх практычных прапаноў, якія-б маглі прывесьці да стварэньня бясьпекі для ўсіх дзяржаў і ўмацаваньня ўсеагульнага міру, або хаця-б зьмяншэньня небясьпекі новых войнаў.** Пры гэтых абставінах асаблівае сусьветнае значэньне набывае магутнасьць Чырвонай арміі, якая стаіць на варце межаў Савецкага саюзу і дапамагае савецкаму ўраду праводзіць сваю палітыку міру.

Нехай жыве Чырвоная армія і яе першы баец таварыш Варашылаў!

Жадаем ёй далейшага ўмацаваньня над сьцягам ленінскай партыі, пад кіраўніцтвам яе правадыра тав. Сталіна!

Літвінаў.

15-я ГАДАВІНА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Урачыстае пасяджэньне ў вялікім тэатры

МАСКВА. Урачыстае пасяджэньне ў гонар 15-годзьдзя РСЧА адбылося ў Вялікім тэатры. Бурнымі незмаўкальнымі апладысмэнтамі сітае заля зьяўленьне ў прэзыдыуме членаў ЦК і МК УсеКП(б), выканкомаў Камінтэрну і Прафінтэрну, ЦВК СССР і ЦВК РСФСР, РВС СССР, РВС МВО, Массавету, прэзыдыуму УсеЦСПС, МССПС, МГСПС, ЦК і МК УсеЛКСМ.

Месцы ў прэзыдыуме займаюць т. т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, АРДЖАНІКІДЗЭ, АНДРЭЕЎ, МІКАЯН, ГАМАРНІК, ТУХАЧЭЎСКІ, КАМЕНЕЎ, БУДЗЁННЫ, АРЛОЎ, МУКЛЕВІЧ, ЭЙДЭМАН, БЛЮХЭР, ЕНУКІДЗЭ, КІСЯЛЁЎ, РЫНДЗІН, БУЛГАНІН, ЯРАСЛАЎСКІ, КАМІНСКІ і інш.

Зьяўленьне т. СТАЛІНА і інш. выклікае бурную авацыю. Ахопленыя адзіным парывам усе ўстаюць і воклічамі «ўра» вітаюць правадыроў. На трыбуне старшыня Массавету Булганін. Коратка адзначыўшы вялікі і слаўны шлях Чырвонай арміі, пройдзены ёю за 15 год, і бліскучыя перамогі Чырвонай арміі, адбіўшай шматлікія напады буйных сіл ворага на ўсіх франтох у грозныя дні грамадзянскай вайны і інтэрвэнцыі, Булганін падкрэсьліў вялізарную ролю т. т. Сталіна, Варашылава і Фрунзэ, як натхніцеляў і арганізатараў перамог Чырвонай арміі за ўвесь перыяд яе існаваньня. Вялізарным энтузіязмам сустракае заля зьяўленьне на трыбуне правадыра Чырвонай арміі тав. ВАРАШЫЛАВА. Ілюструючы яркімі фактамі вялікі дакпад, Варашылаў этап за этапам паказвае гераічны шлях арміі пераможнай пралетарскай рэвалюцыі, асабліва падкрэсьліваючы вялізарную ролю Леніна і Сталіна ў яе арганізацыі і яе перамогах.

Калі Варашылаў закранае ролю і дзейнасьць у Чырвонай арміі тав. СТАЛІНА, які шмат разоў пасылаўся на адказьнейшыя франты грамадзянскай вайны для выпраўленьня цяжкага становішча, усе падымаюцца з месца і бурнымі апладысмэнтамі горача вітаюць любімага правадыра. Свой даклад Варашылаў суправаджаў дэманстрацыяй сьветавых дыяграм, якія характарызуюць рост тэхнічнай магутнасьці Чырвонай арміі, непадзельна зьвязанай з посьпехамі пяцігодкі.

Пасьля дакладу т. Варашылаву была наладжана бурная доўгая авацыя.

З палкім прывітаньнем Чырвонай арміі на ўрачыстым пасяджэньні выступілі прадстаўнікі рабочых маскоўскіх прадпрыемстваў (заводаў імя Сталіна, імя Кагановіча, «Серп і молат», «Дынамо», «Трохгорная мануфактура» і іншых), калгаснікаў Маскоўскай вобласьці, Маскоўскага камсамолу — шэфу чырвонага морскага і паветранага флёту.

У заключэньне на пасяджэньні было пастаноўлена паслаць прывітаньні ЦК УсеКП(б) — СТАЛІНУ, ЦВК СССР — КАЛІНІНУ, СНК СССР — МОЛАТАВУ, ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, РВС СССР — ВАРАШЫЛАВУ.

Пасьля ўрачыстага пасяджэньня адбыўся вечар чырвонаармейскай самадзейнасьці.

Фронт баёў у Жэхэ пашыраецца

Гарады Чаоян, Наньлін і Бэйпяо зруйнаваны

ШАНХАЙ, 23. Паводле паведамленьня кітайскіх газэт у бай у раёне Чаояна японцы страцілі 300 салдат забітымі і параненымі. У Наньліне кітайскія войскі працяюць перайсьці ў контр-наступленьне і затрымаць прасоўваньне японскіх войск. У рэзультаце бесьперапыннага бамбардыраваньня японскіх самалётаў Чаян-Наньлін і Бэйпяо абернуты ў руіны. Японскія паветраныя сілы працяюць разбурыць камунікацыі кітайскіх войск. 22 лютага пачаліся таксама баі ў раёне Цзюмэньскоў. У Цынвандао прыбылі яшчэ тры японскія зьнішчальнікі.

Кітайская газэта Мінбао паведамляе: У Амсі (буйны порт у правінцыі Фуцзян) прыбылі два японскіх крэйсэры).

* * *

МУКДЭН, 23. Паводле паведамленьня японскага камандаваньня, японская дывізія, якая знаходзіцца ў Цзіньчжоў заняла 21 лютага Бэйпяо (канечны пункт чыгункі Цзіньчжоў-Бэйпяо). У паведамленьні паказваецца, што «ні японскія, ні манчкурскія войскі ня выйшлі па-за межы Бэйпяо ва ўсходнім напрамку. Задача гэтых войск заключаецца толькі ў захаваньні бясьпекі руху на чыгунцы Бэйпяо-Чаоянсу». Згодна таго-ж паведамленьня, каля 2 тыс. кітайскіх добраахвотнікаў пад камандаваньнем Лі-Хайцзі па разам з другім добраахвотніцкім атрадам узброеным цяжкай і лёгкай артылерыяй і маючым у сваім складзе мангольскую кавалерыйскую часьць, награжаюць атакай Тункля.

Уплывовая кітайская газэта ў Бэйпіне «Чанбао» лічачы, што Японія рашыла ўварвацца на тэрыторыю ўласна Кітаю, заклікае кітайскі народ улічыць сур'ёзнасьць становішча. Газэта мяркуе, што адначасова з уварваньнем у Жэхэ японцы напалуць на ўзбярэжжа Кітаю.

Японскія драпежнікі ня хочуць дзяліцца здабычай

ТОКІЁ, 23. Міністэрства замежных спраў прапанавала Мацуока пасьля прыняцьця пленумам Лігі нацый дакладу «камісіі дзевятнаццаці», заявіць у дэкларацыі наступнае: 1. Японія на працягу пятнаццаці год у інтарэсах усеагульнага міру ўвесь час супрацоўнічала з Лігай нацый. 2. Урэгуляваньне розных праблем па Далёкім Усходзе нямысьліма без стабілізацыі ўнутранога становішча ў Кітаі і праблем па Далёкім Усходзе. 3. Дастасаваньне палітычнай філёсофіі Захаду да Манчжурыі немагчыма. Адзіны шлях забесьпячэньня ідэальнага міру ў Манчжурыі заключаецца ў захаваньні сёнешняга рэжыму. 4. Рэкамэндацыі «камісіі дзевятнаццаці», накіраваныя да ўрэгуляваньня япона-кітайскага канфлікту, ні пры якіх умовах не магчымы да прыняцьця для Японіі. Калі пленум Лігі прыме рэкамэндацыі, то японскі ўрад ня будзе ў стане ў будучым супрацоўнічаць з Лігай. 5. Адказнасьць за захаваньне міжнароднага міру і вынікі, якія могуць узьнікнуць, у гэтым выпадку падуць на Лігу нацый.

Гітлераўскія банды распераваліся

Начныя напады на рабочыя кватэры

БЭРЛІН, 23. Агенцтва Вольф паведамляе: 23 лютага каля 4 гадзін дня **дом імя Карла Лібкнэхта, дзе знаходзіцца ЦК германскай кампартыі, заняты вялікім атрадам палітычнай паліцыі.** У доме праведзен вобыск.

* * *

БЭРЛІН, 23. Прадвыбарчая кампанія ў Германіі праходзіць пад знакам **выключнай рэпрэсіі супроць кампартыі і камуністычнага друку.** Кожны дзень прыносіць новыя распараджэньні аб забароне сходаў, дэманстрацый і газэт кампартыі. Забаронена выходзячая ў Гале камуністычная газэта **«Ілюстрыртэс Ротэс Эхо»** на два месяцы. У Кольберту забаронена да 25 сакавіка камуністычная газэта **«Дэр Рот Лейхтурм»**, якая абвінавачваецца «ў зьнявазе рэйхсканцлера».

* * *

БЭРЛІН, 23. Орган групы Отто Штрасэра «Дэй Трыбунэ», якая адкалолася ад нацыянал-сацыялістаў, забаронен уладамі да 20 жніўня гэтага году. Забаронена таксама выходзячая ў Дзюрэне газэта партыі цэнтру «Дзюрэнэр цэйтунг».

У цэнтры палітычнай увагі стаіць нячуваны напад, які адбыўся ў ночы на 23 у бэрлінскім рабочым пасёлку **Гросбэрэн, на дом, у якім жылі дзевяць рабочых сем'яў.** Група нацыянал-сацыялістаў уварвалася ў дом і прабавалі прабрацца ў кватэру каменьшчыка **Шломбэха.** Калі ёй удалося ўзламаць дзьверы кватэры, Шломбэх разам з жонкай у адной бялізьне выскачыў праз вакно на вуліцу. Нацыянал-сацыялісты, якія засталіся ў кватэры, падпалілі дом і схаваліся. Дом згарэў.

Зноў забаронена тэрмінам на адзін тыдзень камуністычная газэта, якая выдаецца ў Дрэздэне **«Арбэйтэр Штымме».** Забаронена таксама да 21 сакавіка камуністычная **«Арбэйтэр Цэйтунг»**, якая выходзіць ва Франкфурце на Майне.

Армія беспрацоўных бязупынна расьце

БЭРЛІН, 23. Паводле афіцыяльных даных, беспрацоўе ў Германіі павялічылася з 1 па 15 лютага **на 33 тысячы чалавек.** Агульная колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных складала на 15 лютага 1933 году — 6.047 тыс. чалавек. Толькі 2,5 мільёнаў беспрацоўных атрымліваюць дапамогу.

Урад Прусіі адпагалосна прыняў рашэньне прыступіць з вясны 1933 году **да закрыцьця школ**, якія не знаходзяцца пад уплывам царквы і дзе не выкладаецца «закон божы». Прынцыпова прызнана таксама неабходным увесьці «закон божы», як самастойны прадмет выкладаньня ва ўсіх пачатковых прафэсыянальных школах. Камэнтуючы гэту пастанову прускага ўраду, «Лёкаль Анцэйгар» пішэ: «гаўбніг нацыянальнай канцэнтрацыі пачаў барацьбу супроць бальшавізму ў галіне культуры».

Зводка аб ходзе рамонту трактараў і трактарных плугоў па БССР на 23 лютага 1933 г.

Назва сыстэмы	Адрамантавана: Плугоў.	Адрамантавана: Трактараў.
Ільнатрактарацэнтр	63,4	30,8
Збожжэтрактарацэнтр	48,1	39,8
Гародн.-бульб. Трак. цэнтр	54,3	37,8
Насентрэст	80,4	35,4
Сэдгародтрэст	39,3	18,5
Лугтрэст	67,3	39,2
Іншыя аб'яднаньні	51,0	26,9
Асобныя калгасы	—	—
Разам па сыстэме НКЗБ	57,9	32,5
Па сыстэме Упаўнаркамсаўгасаў	—	26,8

* * *

Работа па рамонту трактараў, прычэпнага інвэнтару і запасных частак яшчэ не набыла належных бальшавіцкіх тэмпаў і не гарантуе своячасовага выкананьня ўрадавага заданьня па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Аб гэтым з усёй яснасьцю кажа тое, што амаль за два месяцы — студзень-люты — па рамонту трактараў заданьне выканана толькі на 29,6 проц., або менш як на адну трэцюю ўсяго трактарнага парку, падлягаючага рамонту.

Няма і на моска быць ніякіх прычын, каб апраўдаць адставаньне ў рамонце па асобных МТС і МТМ.

Яркі прыклад таго, як трэба пабальшавіцку змагацца за рамонт трактараў, паказалі: **Буда - Кашалёўская** МТС, якая адрамантавала цалкам увесь трактарны парк, **Талачынская** — на 78,6 проц., **Дрысенская** — на 76,2 проц. і цэлы рад іншых МТС.

На фоне гэтых ударных прыкладаў работы становіцца зусім відавочнай апартуністычная бязьдзейнасьць **Сураскай, Боркавіцкай, Чавускай, Крычаўскай, Хойніцкай** і іншых МТС, якія зусім не прыступілі да рамонту трактараў, хаця мелі ўсе магчымасьці, як і перадавыя МТС, гэту работу разгарнуць своячасова.

Партыйныя арганізацыі ўказаных раёнаў не ўзялі рамонту трактараў пад асабісты нагляд і не забясьпечылі належнага бальшавіцкага кіраўніцтва ім.

Прафсаюзныя раённыя арганізацыі па сутнасьці стаяць у баку ад гэтай адказьнейшай задачы. Прычым некаторыя з іх, як, напрыклад, **Магілёўскі і Гомельскі** прафсаветы, а таксама заўхомы заводаў **«Чырвоны адраджэнец», «Чырвоны мэталіст»** і інш., праявілі поўную бязьдзейнасьць у гэтай рабоце. Яны ня здолелі як сьлед мабілізаваць шырокія рабочыя масы на бальшавіцкую барацьбу за хутчэйшае сканчэньне рамонту і выпуск запасных частак, на барацьбу за якасьць прадукцыі, на барацьбу з цеганінай у справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Тэмпіў, які застаўся да канца кампаніі, зусім даволі для таго, каб поўнасьцю выканаць заданьні ўраду. Неабходна толькі як сьлед разгарнуць работу з тым, каб у самы кароткі тэрмін мабілізаваць масы на яго выкананьне.

Выкананьне за пяцідзеўку 4 проц. пляну зусім невыстарчальнае. Гэтыя тэмпы павінны быць павялічаны, прычамсі, у 5-6 раз з тым, каб забясьпечыць выкананьне заданьня ў тэрмін.

Зробім нашы калгасы сапраўды бальшавіцкімі

Перадавыя калгасы БССР адказваюць на адозву ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

„Даем наша калгаснае слова"

«З вялікай увагай мы, калгасьнікі с.-г. арцелі **«УДАРНІК»**, Дзяржынскага раёну, прапрацавалі адозву 1-га ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Што ні радок, што ні слова, то наша ярэўная калгасная справа.

Мы ня думаем адказваць на адозву агульнымі фразамі. Патрэбна практычная работа, патрэбна бальшавіцкая дзелавітасьць.

Зямлі мы атрымалі ад нашай савецкай улады даволі. Вось, напрыклад, у нас па кожную гаспадарку прыпадае па 7,5 гектараў чыстае пахаці. Дзяржава дапамагае нам апрацаваць зямлю такімі машынамі, якіх раней ніхто з нас нават і ў вочы ня бачыў. Вясной 1932 году Дзяржынская МТС узарала трактарамі нашаму калгасу 60 гектараў, увосень—40. Аб'яднаўшы ў калгасе нашы сродкі і сілы, мы набылі з дапамогай дзяржавы 3 жнівяркі, касілку, радзіўную сяялку і іншыя машыны.

«Цяпер уже пара падумаць аб узьняцьці ўраджайнасьці калгасных палёў, аб узьняцьці даходнасьці калгасаў—так заявілі дэлегаты ўсесаюзнага зьезду) калгасьнікаў-ударнікаў.

Што і гаварыць! Наш калгас зусім пропна змагаўся за ўраджайнасьць. У 1931 годзе з аднаго гектару мы сабралі толькі 37,5 пудоў жыта, 73 п. ячменю, 37,5 п. аўса і 500 пудоў бульбы. У 1932 годзе справа трошкі палепшылася. З аднаго гектару мы сабралі: 40 пудоў жыта, 75 п. ячменю і 55 п. шпаніцы. З аўсом, аднак, зусім падкачалі, сабралі ўсяго 20 пудоў з гектару.

Сёлета мы даем нашу калгаснае слова сабраць па збожжавых культурах ня менш 54 пудоў з аднаго гектару і па бульбе—660 пудоў.

Каб нашы абавязацельствы не засталіся толькі добрымі пажаданьнямі, мы загадзя ўкылі і цэлы рад мерапрыемстваў, якія забясьпечаць удым ураджайнасьці.

Насенны і страхавы фонды адсартаваны і знаходзяцца ў добрых засеках пад надзейнай аховай вартаўнікоў, нашых выпрабаваных калгасьнікаў Дубавіка і Багдановіча.

З нашага яравога кліну ў 260 га мы звыш 200 гектараў сеем па зяблеве. Усе 36 плугоў адрамантаваны. Прывезьлі ў поўную спраўнасьць тэксама ўсе бораны і 24 драбіны да колаў. Засталося адрамантаваць яшчэ 6 драбін. Збруя да палявых работ (хамуты, сядзёлкі і інш.) у двух брыгадах ужо адрамантавана. Абавязваемся да 1-га сакавіка скончыць рамонт астатняй збруі драбін.

Цяпер, самай дарогай, ударным парадкам нашы тры брыгады вывозяць торф і гной. Ужо вывезьлі 700 возаў гною і 700 торфу па аддаленыя палі і склалі ў вялікія кучы такім парадкам: пласт торфу, пласт гною і наверх зноў торф. Вывазка разгортваецца. Плян тарфаваньня, вызначаны нам райса ў 3 гектары перакроем у 8 раз. Затарфуем 25 гектараў. Вывезьлі 8 тон вапны і сабралі 7 цэнтнэраў попелу.

Цягавая сіла карыстаецца ў нас пільнай увагай. Коні замацаваны ўжо за брыгадамі. У саміх брыгадах за кожным калгасьнікам замацавана па двое коняй. Гадуем 7 штук маладняка. На час сяўбы жывая цягавая сіла цалкам забясьпечана кармамі (аўсом, сенам, капюшынай і г. д.). Кармы захоўваюцца ў асобным памяшканьні, каб ніхто не кваціўся на іх.

Мы абвінчаем сяе ўдарнікамі першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі і будзем няўхільна ажыцьцяўляць пастановы сэсіі ЦВК СССР аб барацьбе за працоўную дысцыпліну ў калгасах, ачышчаючы нашы рады ад кулацкіх элементаў.

На сацыялістычнае спаборніцтва за лепшы ўраджай выклікаем калгас «Культура», Бораўскага сельсавету нашага раёну.

Пад кіраўніцтвам свайго першага калгасьніка-ўдарніка тав. Сталіна з гонарам выканаем задачы першай вясны другой пяцігодкі.

Ад імя калгасьнікаў с.-т. арцелі «Ударнік»:

Фукаці Багдана Дзедзя

39 НОВЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ

ВІЦЕБСК, 23. (Па тэлефону).

«Мы, калгасьнікі калгасу імя Чырвонай арміі, Елагінскага сельсавету, Віцебскага раёну, прымаючы актыўны ўдзел у рабоце ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў праз нашага дэлегата **ЯКУБА РАЎКОВА**, у адказ на адозву зьезду да ўсіх калгасьнікаў Савецкага саюзу даем слова:

Не пазьней 24 лютага канчаткова распрацаваць і давесьці да кожнай брыгады і калгасьніка пасэўны плян.

Мы ссыпалі і адсартавалі насенны і страхавы фонды і захоўваем іх пільна і беражліва. Абавязваемся не пазьней 1 сакавіка пратруціць насеньне.

Рамонт інвэнтару, збруі 1 калёс у нашым калгасе закончан. Бяромся да пачатку сяўбы падрыхтаваць у якасьці запасных 35 новых калёс, 15 боран, 20 новых хамутоў. Увесь інвэнтар, калёсы і збруя прымацаваны да паасобных брыгад і калгасьнікаў, якія адказваюць за іх поўнае захаваньне.

Усе калгасныя коні разьбіты па групах па іх працаздольнасьці. Да коней прымацаваны пастаянныя конюхі. Да кожнага калгасьніка прымацаваны коні, калёсы і збруя. Слабасільныя коні пастаўлены на ўзмоцнены корм. Абавязваемся і надалей захоўваць і берагчы нашых коняй, падкоўваць, штодзенна чысьціць капыты, і г. д. Створаны фуражны корм з грэчкі, капюшыны і сена, абавязваемся правільна і рацыянальна скарыстоўваць па прызначэньні.

У мэтах паўнапэньня ўраджайнасьці абавязваемся да пачатку сяўбы вывезьці 16.000 возаў гною, 40 тон вапны, 92 цэнтнэры попелу і 270 тон торфу для ўгнаеньня на подсьціл. Бульбу будзем садзіць пад маркер, а пасевы збожжавых культур рабіць выключна радковай сеяркай.

У мінулым годзе наш калгас пляны загатовак выканаў датэрмінова. Абавязваемся па прыкладу мінулага году поўнасьцю і датэрмінова выканаць плян загатовак 1933 году.

Мы цалкам і поўнасьцю далучаемся да пастановы сэсіі ЦВК СССР аб барацьбе за жалезную працоўную дысцыпліну ў калгасах. Лодыраў і прагульшчыкаў, гэтых памочнікаў кулака выганім з нашых радоў. За першы прагул будзем штрафаваць, а пры паўтарэньні—выключаць з калгасу. Прапануем праўленьню строга сачыць за выкананьнем гэтай пастановы.

Кіруючыся ўказаньнем тав. Сталіна, мы пачалі ачыстку нашага калгасу ад клясава-варожых кулацкіх элементаў. 13 такіх шкодніка́ў мы ўжо выключылі. У адказ на гэта **39 АДНААСОБНІКАЎ УСТУПІЛІ Ў НАШ КАЛГАС.**

Будзем і надалей самаачышчацца ад кулакоў, жулікаў, злодзеяў, прагульшчыкаў, п'яніц, лодыраў і зробім наш калгас сапраўды бальшавіцкім».

Ад імя калгасьнікаў: **Паўлоўскі, Раброў, Арлоўскі.**

УВОДЗІМ СЕВАЗВАРОТ

ВОРША, 22. (Па тэлефону).

З выключнай увагай і цікавасьцю прапрацавалі члены калгасу **«ПРАЛЕТАРЫЙ»**, Пішчалаўскага сельсавету адозву першага ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Адзвалушна ўхваляючы гэту адозву, калгасьнікі заявілі:

«Во, гэта правільна. Толькі так, як вучыць нас тав. Сталін, як раяць нашы лепшыя ўдарнікі, мы зможам забясьпечыць ударнае правядзеньне веснавой сяўбы, павысіць ураджайнасьць, у тэрмін выканаць свае абавязкі перад дзяржавай і забясьпечыць сябе хлебам».

Калгасьнікі с.-т. арцелі «Пралетары» заканчваюць сьпіку насенных і страхавых фондаў. Амаль поўнасьцю, за выключэньнем калёс, адрамантаваны і захоўваюцца ў парадку сельгасмашыны і збруя. Усе коні добра дагледжаны. Вылучана патрэбная колькасьць кармоў.

Але гэта яшчэ ня ўсё,—заявілі калгасьнікі. У адказ на адозву яны пабрацімаваліся:

канчаткова весьці севазварот, мачоры на ўвазе пашырэньне збожжавых культур і закончыць разьбіўку калгасьнікаў на брыгады да 2 сакавіка.

Праўленьне калгасу ўзяло на сябе абавязак неадкладна забясьпечыць пастаянны пяцідзённы ўлік работы і давесьці да кожнага калгасьніка нормы выпрацоўкі.

У калгасе ўстанаўляецца штодзённая чыстка коняй і агляд іх капыт.

Пралетарцы выклікалі на спаборніцтва суседні калгас «Рабочая культура».

К.

ПАПРАЎКА

У прамове тав. **Сталіна** на першым усесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў 19 лютага 1933 г., зьмешчанай у «Зьвязьдзе» № 43 ад 24 лютага **па віне друкарні** пераблытаны радкі ў самым канцы другой калёны, у абзацы: «Ёсьць людзі, якія думаюць» і г. д. Гэта месца трэба чытаць так: **«На самой справе гэта ня трэці шлях, а другі,—шлях да капітэалізму. Бо што значыць вярнуцца да аднаасобнай гаспадаркі і аднавіць кулацтва?»**

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)
Сёньня Кузьма-чорны
БАЦЬКАЎШЧЫНА
Эпопея ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 гадзін вечара. Білеты ў раб. касе і касе тэатру.

Чырвоная зорка Каса ад 1 г. дня
Гукавы фільм выт. Белдзяржкіно Першы ўзвод

Кіно ПРАЛЕТАРЫ
Мастацкі фільм Зьмеінае джала
Драма ў 6 частк.
Дзесяты дзіцячы сэанс Асобная Далёка-Ўсходняя

СПАРТАК Каса гадз. дня
ВЫДАТНЫ ФІЛЬМ СОРАК ПЕРШЫ
Драма ў 6 частках

АНОНС! Гэтымі днямі МЕНДЗЯРЖКІНО АДКРЫВАЕ
ПЕРШЫ Ў БССР НОВА-ПАБУДАВАНЫ
ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР
Савецкая, 90 (памяшк. б. кірхі).
Сачэце за рэклямай!
Бліжэйшыя пастаноўкі:
1. Пераможцы (дзіцячы гукавы кіно-фільм).
2. Адзнака часу (дзіцячы гукавы кіно-фільм).
3. Разам з бацькамі (нямы фільм) і г. д. МЕНДЗЯРЖКІНО.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Ад 25 лютага мастацкі фільм выт. САЮЗНІНО
ДЗЯРЖАЎНЫ ЧЫНОЎНІК
РЭЖЫСЭР І. ПЕР'ЕЎ.
У галоўных ролях: М. Штраух, Н. Рагожын, Л. Юрэнеў і А. Антонаў.
Зьвыш праграмы КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО.
Каса адкрыта з 12 гадз. дня.

АДКРЫЦЬЦЕ 1, 2, 3 сакавіка
ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР (Валадарская, 7)
АДКРЫЦЬЦЕ 1, 2, 3 сакавіка
МЮЗІК-ХОЛ
гастролі ТЭА-ДЖАЗА БАРЫСА РЭНСКАГА
Штодзённа 2 выступленьні. Пачатак 1-га ў 3 г., 2-га ў 10 г.
Білеты ў рабінасе і касе тэатру. Прымаюцца замовы на культпаходы.
Дзеці да 16 год не дапускаюцца.

28 ЛЮТАГА. у 7 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу імя К. Маркса адкрываецца
ПЕРШАЯ ГАРАДСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ
8 скліканьня
ўпаўнаважаных МГРК.
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Даклад Белкаапсаюзу аб чарговых задачах спажыўкаапэрацыі. 2. Справаздача аб працы праўленьня МГРК за 1932 г. 3. Зацьвярджэньне кантрольных лічбаў на 1933 г. і балянсу за 1932 г. 4. Выбары праўленьня МГРК. 5. Выбары кантрольна-рэвізійнай камісіі. 6. Прыняцьце наказу. 7. Перагляд статуту.
Выдача мандатаў дэлегатам канфэрэнцыі праводзіцца штодзённа ў арг. кас. сэктары (Савецкая, 43, пакой 4, 3-ці паверх) з 9 да 4 г. дня.
фракцыя канфэрэнцыі адбудзецца 28 лютага, у 6 гадз. вечара там-жа.
Праўленьне МГРК.

26 лютага у 6 гадз. вечара, у зэлі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі, 4, 3-ці паверх) адбудзецца
пасяджэньне пленуму Менскага гарадзкога савету
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі III сэсіі ЦВК СССР і IV сэсіі ЦВК БССР і задачы веснавой сяўбы (дакл. т. Чарвякоў і Валодзька).
2. Даклад мандатнай камісіі (дакл. т. Пінхасін).
3. Арганізацыйныя пытаньні.
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў у члены гарсавету абавязкова
Прэзыдыум гарсавету

Пасяджэньне фракцыі КП(б)Б гарсавету
АДБУДЗЕЦЦА ў залі пасяджэньняў гарсавету
26 лютага, у 5 гадз. вечара
Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў КП(б)Б—членаў гарсавету абавязкова
Фракцыя КП(б)Б прэзыдыум гарсавету

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ТРЫМАЛЬНІКАЎ
КНІЖНЫХ БОН,
ШТО З 15 САКАВІКА
СПЫНЯЕЦЦА ПРЫЁМ ГЭТЫХ БОН У АБМЕН НА ЛІТАРАТУРУ.
Пасьля 15 сакавіка арганізацыі, якія выдалі боны сваім супрацоўнікам, павінны сабраць нескарыстаныя боны і прад'явіць іх да пагашэньня шляхам абмену на літаратуру, у кнігарні «КОГИЗ»а РСФСР.
Тэрмін пагашэньня устанаўляецца да 1-га красавіка, пасьля чаго боны зусім АНУЛЮЮЦЦА.
Беладдзяленьне „КОГИЗ"а РСФСР.

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА"
ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА
Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
ЁСЬЦЬ У ПРОДАЖЫ і РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ
БЕЛАРУСЬ КАЛГАСНАЯ
№ 8 (1932 г.) Цана асобнага нумару 80 к.
Штомесячная літаратурна-мастацкая часопісь Аб'яднаньня Пралетарска-калгасных Пісьменьнікаў.
ЗЬМЕСТ:
МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.—Салавей-разбойнік (аповяд.)
НАВУРЫН-ДЗЮБЯНКОЎ.—Залаты вуб (аповяд.)
Ц. ГАРТНЫ.—Змагар (аповесьць)
Ю. БІТУС.—Падшыпнікі (аповяд)
ВАЛЕРЫ МАРАНОЎ, С. ФАМІН, С. НОРТМАН, А. БУЗА І Р. ХАЦИЕВІЧ—вершы.
ХРОНІКА.
Патрабуйце на ўсіх кнігарнях і газэтных кіёсках.

Дзяржаўнаму Выдавецтву Беларусі
ПАТРАБУЕЦЦА кваліфікаваная
машыністка,
якая добра ведае беларускую мову
Зварачацца ў канцылярыю.

Келектыў супрацоўнікаў Наркамасьветы выказвае сваё спачуваньне тав. БЯЛУГА Рыгору з прычыны сьмерці яго МАТКІ
Выпас цела адбудзецца сёньня 25-га лютага, у 4 з паловай гадзіны веч., з дому № 30, па Пралетарскай вул.

ПАСТАНОВА

Народнага камісарыяту працы БССР

20 лютага 1933 г. № 7 г. Менск

„Пра выяўленьне і зварот у органы Наркамзему і Упаўнаркамсаўгасаў зямляўпарадкавацеляў, аграномаў і заатэхнікаў, што працуюць зараз не па спэцыяльнасьці".

У мэтах забесьпячэньня кадрамі спэцыялістаў для пасьпяховага правядзеньня плану зямляўпарадкаўчых работ на 1933 г. і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы на падставе пастановы СНК БССР ад 16-II г. г., Народны Камісарыят Працы БССР

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усіх кіраўнікоў дзяржаўных, каапэрацыйных і грамадзкіх устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў пад іх асабістую адказнасьць на працягу 2-х дзён з дня выданьня гэтай пастановы, прадставіць імяныя сьпісы на ўсіх зямляўпарадкавацеляў, аграномаў і заатэхнікаў, што працуюць зараз не па сваёй спэцыяльнасьці, па Менску непасрэдна НКП БССР, па Гомелю, Віцебску, Магілеве, Бабруйску, Воршы, Полацку, Варысаве і Рэчыцы мясцовым інспэктарам працы, якія ўсе сьпісы прадстаўляюць у НКПБ да 26-II і на астатніх раёнах—райінспэктарам працы, а апошнія прадстаўляюць усе сьпісы ў НКПБ да 28-II г. г.

Імяныя сьпісы прадставіць па наступнай форме: а) прозьвішча імя і імя па бацьку; б) спэцыяльнасьць; в) стаж; г) займаемая пасада, д) адукацыя (якую навучальную ўстанову скончыў 1 калі); е) нацыянальнасьць; ж) сац. становішча; з) партыйнасьць; і) Пол; і к) Хатні адрас.

2. Члену Калегіі т. **Сакольчыку** сумесна з прадстаўнікамі НКЗему, Упаўнаркамсаўгасаў і ЦСПСБ зрабіць разьмеркаваньне і накіраваньне зямляўпарадкавацеляў, аграномаў і заатэхнікаў па раёнах з такім разьлікам, каб забясьпечыць гэтымі спэцыялістамі раёны ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі, не дапускаючы непатрэбнай перакідкі спэцыялістаў з раёну у раён.

Усю гэту работу скончыць да 5 сакавіка г. г.

3. У адносінах зямляўпарадкавацеляў, аграномаў і заатэхнікаў перакідваемых у іншыя раёны, распаўсюдзіць усе гарантыі і кампэнсацыі, прадугледжаныя пастановай СНК БССР ад 17 лютага г. г.

4. Абавязаць усіх кіраўнікоў па атрыманьні распараджэньня НКПБ аб накіраваньні спэцыяліста на працягу 2-х дзён вызваліць ад работы і зрабіць з ім поўны разьлік.

5. Наркамправам БССР папярэджвае ўсіх кіраўнікоў, што ўсякія спробы затрымаць работніка, захаваць спэцыяльнасьць яго, ухіленьне ад выяўленьня ўказаных спэцыялістаў, а таксама ухіленьне работніка ад пасадкі ў раён, будзе разглядацца, як зрыў важнейшага мерапрыемства падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і вінаватыя будуць прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці ў адпаведнасьці з арт. 102 Крым. Кодэксу БССР.

Народны камісар працы БССР **БАСКІН.**

Член калегіі НКПБ—нач. сэкр. па Заб. Нар Гасп. Кадрамі **САКОЛЬЧЫК**

Менск, друкарня «Зьвязды» Галоўлітбел № 337